Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

8 ЛЮТАГА 2008 г.
ПЯТНІЦА
№ 25 (26138)

Кошт 490 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

Увага! Прамая лінія

«ПРАЦОЎНЫЯ» ЗАКОНЫ: ЁСЦЬ ПЫТАННІ?

Кантракты, выпрабавальны тэрмін, гарантыі маладым спецыялістам, водпускі, тэрміны выплаты зарплаты, працоўны час і ўмовы працы, нарэшце, некаторыя асаблівасці новага Працоўнага кодэкса — усё гэта стане тэмай чарговай «прамой лініі» газеты «Звязда» з удзелам **намесніка дырэктара дэпартамента дзяржаўнай інспекцыі працы Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Ірыны Фёдараўны ШЫЛЯЕВАЙ.**

ТАКІМ ЧЫНАМ, УВАГА! Згодна з папярэдняй дамоўленасцю, наша «прамая лінія» пройдзе **14 лютага з 16.00 да 17.30 па рэдакцыйных тэлефонах: (8 017) 292 38 21 і 292 38 92. Папярэднія пытанні прымаюцца па нумары (8 017) 287 17 57.**

ЗАРПЛАТЫ ЎЗНІМЕ ЭКАНОМІКА

«Мы павінны значна павялічыць узровень зарплаты ў рэальным сектары эканомікі», — заявіў на калегіі Міністэрства прамысловасці прэм'ер-міністр Беларусі Сяргей Сідорскі. Пры гэтым ён заўважыў, што прагназуемая раней на канец 2010 года сярэдняя зарплата ў краіне ў 500 долараў ЗША ў эквіваленце ўжо не можа задавальняць. «Не 300—400 долараў, а ў два разы вышэй», — акрэсліў планы на будучае кіраўнік урада. Аднак пры гэтым зазначыў, што каб рэалізаваць задуманае, неабходна істотна павялічыць тэмпы эканамічнага росту ў рэспубліцы.

Сяргей Сідорскі прызнаў паспяховай працу Міністэрства прамысловасці летась. Добрых вынікаў міністэрству ўдалося дасягнуць нягледзячы на аб'ектыўныя цяжкасці, якія аказвалі ўплыў на развіццё айчыннай эканомікі. Паводле інфармацыі міністра Анатоля Русецкага, аб'ём вытворчасці прадукцыі ў супастаўных цэнах у адносінах да аналагічнага перыяду 2006 года склаў 113,8 працэнта пры заданні 109,5—111 працэнтаў. А знешнегандлёвы абарот па галіне перавысіў 9 мільярдаў долараў (135 працэнтаў да 2006 года), прычым рост тавараабароту адбыўся як з краінамі СНД, так і далёкага замежжа: было экспартавана тавараў на суму 5,8 мільярда долараў. Удзельная ж вага новай прадукцыі ў агульным аб'ёме прамысловай вытворчасці дасягнула 32,1 працэнта. Разам з тым Сяргей Сідорскі бачыць і шэраг праблемных кропак галіны, якія не задавальняюць кіраўніцтва краіны. У прыватнасці, ён звярнуў увагу на тое, што 72 працэнты экспарту прадукцыі прадпрыемстваў міністэрства забяспечваецца валаўтваральнымі прадпрыемствамі.

Акрамя таго, прэм'ер лічыць, што аб'ём замежнага капіталу, які паступае ў рэспубліку, недастатковы. «Вы сядзіце на сваіх месцах, — звярнуўся Сяргей Сідорскі да прысутных, — і вынік такой пазіцыі — нямногім больш за паўмільёна прамых замежных інвестыцый». Пад ляжачы камень вада не цячэ — з інвестарамі патрэбна працаваць, падкрэсліў прэм'ер. Так, напрыклад, Еўрапейскі саюз распрацаваў праграму аб перанясе заводаў і буйных вытворчасцяў у іншыя краіны, аднак нашай рэспубліке ў гэтай праграме няма, і праекты, якія маглі б быць у ёй заяўлены, не прапрацоўваюцца.

Сёння кіраўнікі многіх прадпрыемстваў «спяць у шапку» і нават не бачаць, што попыт на іх прадукцыю значна перавышае фактычныя аб'ёмы паставак. Напрыклад, летась у суседнюю Украіну было недапастаўлена беларускай прадукцыі на 30 мільёнаў долараў. Падобнае становішча спраў неабходна выпраўляць і нарошчваць экспартныя пастаўкі. Між іншым, прэм'ер паведаміў пра тое, што абмеркаваў з кіраўніком урада Украіны Юліяй Цімашэнкай у тэлефоннай размове пытанні аб нарошчванні нашага экспарту ў гэту краіну. Гутарка, зазначыў ён, прайшла вынікова: прэм'еры дамовіліся аб узнаўленні работы змешанай камісіі гандлёва-эканамічнай групы, што павінна павялічыць тавараабарот паміж абедзвюма краінамі.

«Мы чакаем больш хуткіх, ураўвальных вынікаў ад навукова-даследчых, канструктарскіх, праектных работ. Неабходны новыя тэхналогіі, прарыўныя распрацоўкі ў галіне мікраэлектронікі, нана- і біятэхналогіі, радыёэлектронікі. Мы павінны пабудаваць новыя прадпрыемствы на аснове айчынных тэхналогій», — падкрэсліў Сяргей Сідорскі. На яго думку, не менш за 80 працэнтаў навуковых распрацовак, што ўкараняюцца ў вытворчасць, павінны быць айчыннымі.

Ігар ШЧУЧЭНКА.

Увядзенне мараторыю на смяротную кару?

Беларусь гатова аб'явіць мараторый на прымяненне смяротнай кары. Такую думку ў гутарцы з карэспандэнтам БЕЛТА выказаў старшыня Пастаяннай камісіі па заканадаўству і судова-прававых пытаннях Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі Аляксандр Архіпаў. Пры гэтым ён не выключыў неадназначнай рэакцыі грамадства ў выпадку ўвядзення мараторыю на прымяненне смяротнай кары. «Грамадства, якое на рэферэндуме выказалася за захаванне смяротнай кары, можа не зразумець яе адмены. Нельга, клапоцячыся аб злачынцах, забываць пра пацярпелых, іх родных і блізкіх», — сказаў парламентарый. Калі ў 2007 годзе было вынесена толькі 3 смяротныя прыгаворы, то былі гады, калі іх колькасць дасягала 47—48.

У ЧАТЫРЫ НІТЫ І ЧАТЫРЫ РУКІ

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Выпускніца аддзялення дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва Салігорскага педагагічнага каледжа ***Таццяна ВОЛКАВА*** *(на фота справа) трэці год працуе майстрам-метадыстам Капыльскага раённага цэнтра ткацтва, што ў вёсцы Семежава.*

Традыцыйныя народныя ўзоры Таццяна пераняла ад вядомай ткачыхі-капылянкі Валянціны Кіені.

Кіруе незвычайнай установай у вёсцы ***Наталля ХОЛАД*** *(на фота злева).*

Урад Беларусі зацвердзіў парадак выплаты дапамогі на аздараўленне асобным катэгорыям грамадзян

Палажэнне рэгулюе парадак выплаты грашовай дапамогі на аздараўленне, прадугледжанай законам «Аб дзяржаўных сацыяльных ільготах, правах і гарантыях для асобных катэгорый грамадзян», Героям Беларусі і Савецкага Саюза, Героям Сацыялістычнай Працы, поўным кавалерам ордэнаў Айчыны, Славы, Працоўнай Славы, непрацуючым інвалідам і ўдзельнікам Вялікай Айчыннай вайны і інвалідам баявых дзеянняў на тэрыторыі іншых дзяржаў, непрацуючым асобам, якія прымалі ўдзел у складзе спецфарміраванняў у размініраванні тэрыторый і аб'ектаў пасля вызвалення ад нямецкай акупацыі ў 1943—1945 гадах. Дапамога таксама прадугледжана непрацуючым грамадзянам з ліку ваеннаслужачых, асобаў начальніцкага і радавога складу органаў унутраных спраў, органаў і падраздзяленняў па надзвычайных сітуацыях, органаў фінансавых расследаванняў Камітэта дзяржаўнага кантролю, якія сталі інвалідамі ў выніку ранення, кантузіі, калецтва або захворвання, атрыманых пры выкананні службовых абавязкаў, акрамя выпадкаў, калі інваліднасць настала ў выніку процідзяржаўных дзеянняў, па прычыне алкагольнага, наркатычнага, таксічнагаап'янення і членашкодніцтва.

Дапамога будзе выплачвацца названым катэгорыям органамі, якія ажыццяўляюць пенсійнае забеспячэнне, толькі калі яны не выкарысталі права на бясплатнае санаторна-курортнае лячэнне або аздараўленне ў мінулым каляндарным годзе. Грамадзяне, якія не з'яўляюцца пенсіянерамі, атрымаюць дапамогу ад Рэспубліканскага цэнтра па аздараўленні і санаторна-курортным лячэнні насельніцтва. Памер выплат складзе 10 базавых велічынь, устаноўленых на 31 снежня года, у якім не было выкарыстана права на бясплатнае санаторна-курортнае лячэнне або аздараўленне. А атрымаць грошы можна будзе ў 1-м квартале наступнага за ім года. Выплачвацца дапамога будзе за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту праз арганізацыі паштовай сувязі, банкі, арганізацыі, якія ажыццяўляюць дзейнасць па дастаўцы пенсій.

У выпадку смерці грамадзяніна, які меў права на атрыманне дапамогі на аздараўленне, яе выплата членам сям'і не праводзіцца.

Пастанова ўступіла ў сілу з 1 студзеня гэтага года.

«ІМПАРТНЫ» КАРУПЦЫЯНЕР

В'етнамскі прадпрымальнік Буй Ван Чыена, які жыў у Мінску і ўзначальваў іншаземнае прадпрыемства «Хіміка-плюс», за 9 гадоў атрымаў ад сваіх суайчыннікаў хабар на агульную суму больш за 77 тысяч долараў.

Паводле звестак прэс-цэнтра Генеральнай пракуратуры Беларусі, ад дырэктара замежнай фірмы ў многім залежала, ці будуць прадоўжаны тэрміны часовай рэгістрацыі яго землякоў у Мінску і Гродне. Таму за накіраванне адмысловых хадайніцтваў у тэрытарыяльныя ўпраўленні па грамадзянстве і міграцыі Буй Ван Чыена браў з кожнага суайчынніка хабар у памеры ад 300 да 700 долараў. Нядаўна ў Гродне адбыўся суд, які прыгаварыў «імпартнага» карупцыянера да сямі з паловай гадоў пазбаўлення волі з канфіскацыяй маёмасці.

Мікола ДЗЯБЁЛА.

АД ВУГОЛЬЧЫКАЎ КАДЗІЛА ЗАГАРЭЛАСЯ ЦАРКВА

Ад пажару пацярпеў Свята-Троіцкі храм у вёсцы Расна Дрыбінскага раёна. Пасля заканчэння суботняй дзённай службы прыхаджане разышліся, але праз пэўны час убачылі дым над дахам.

Паводле паведамлення Магілёўскага абласнога ўпраўлення МНС, агонь пашкодзіў кроўлю. Таксама пацярпела ўнутранае ўбранне і царкоўныя прылады: усё было чорнае ад дыму і копаці.

Выявілася, што прычынай пажару стала банальная неасцярожнасць: вуглі з кадзіла выкінулі не ў металічнае вядро з вадой, а ў простую сметніцу, дзе былі паперы. Пяць гадоў праваслаўныя вернікі рамантавалі будынак, дзе калісьці знаходзілася вясковая крама, і рабілі з яго царкву. Цяпер ім, відаць, паслана новае выпрабаванне: давядзецца зноўку прыводзіць у парадак свой вясковы храм.

Ілона ІВАНОВА.

З ВЕРТАЛЁТА ЛЕПЕЙ ВІДАЦЬ ПАРУШАЛЬНІКАЎ

Кантрабандыстам рознага тавару з суседняй Украіны стала цяжэй дабірацца нават ляснымі сцяжынамі. Пінскі пагранічны патруль вядзе назіранне за мяжой з верталёта. Вось і днямі з верталёта вартавыя мяжы заўважылі легкавушку, якая набліжалася не з боку афіцыйнага пераходу. Аўтамабіль быў даверху загружаны гарэлкай і цыгарэтамі. Кантрабандны тавар затрымалі.

Яна СВЕТАВА.

МІЛІЦЫЯ СУПРАЦЬ ХАБАРНІЦТВА

Па абвінавачанні ў атрыманні хабару затрыманы начальнік аднаго з участкаў жыллёва-камунальнай гаспадаркі Магілёўскага раёна. Паводле папярэдняй інфармацыі, 41-гадовы мужчына атрымаў ад сваіх падначаленых 200 тысяч рублёў, каб іх не звольнілі з працы за прагулы.

Факты хабарніцтва выкараняе міліцыя Магілёўскай вобласці. У студзені ў Бабруйску была затрымана супрацоўніца аднаго з гарадскіх прадпрыемстваў. Эканаміст узяла 1000 долараў за тое, каб можна было атрымаць матэрыялы са склада па-за чаргой. Жанчыну злавілі з доказамі злачынства.

— Мы ўдасканальваем працу па супрацьдзеянні крыміналізацыі эканомікі, — паведаміў начальнік УУС Магілёўскага аблвыканкама Аляксандр Канавалаў. — Летась мы выяўлялі факты, дзе хабар дасягаў 9 тысяч долараў і вышэй. Напрыклад, у 2007 годзе быў затрыманы кіраўнік прадпрыемства «Магілёўаблрэсурсы», які за хабар выдзяляў квоты на дэфіцытны цэмент. Знойдзены злоўжыванні пры будаўніцтве ў вёсцы Чавускім раёне. Аляксандр Канавалаў расказаў і пра здарэнне ў Шклоўскім раёне: чалавек звярнуўся ў праваахоўныя органы з паведамленнем, што ў яго нібыта вымагае грошы за вырашэнне праблемы супрацоўнік райвыканкама. Пры расследаванні выявілася, што гэта быў звычайны махляр, які проста ўваходзіў у будынак, дзе месціцца раённая ўлада, і рабіў выгляд, што там працуе і нешта вырашае.

Ілона ІВАНОВА.

АТРУЦІЛІСЯ ГАЗАМ

У Брэсце сям'я з чатырох чалавек трапіла ў бальніцу з дыягназам атручэнне чадным газам. Бяда здарылася ў доме па вуліцы Славянскай. Спачатку ў абласную бальніцу даставілі дзяцей — дзяўчат 11 і 17 гадоў, а затым і іх бацькоў. Праўда, пасля аказання медыцынскай дапамогі ўсе яны выпісаны дадому. Паводле папярэдняй версіі спецыялістаў, прычынай здарэння стала няспраўнасць газавага катла.

Яна СВЕТАВА.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Міністр інфармацыі Уладзімір РУСАКЕВІЧ і Патыяршы Экзарх усея Беларусі ФІЛАРЭТ у час урачыстасці.

ЯШЧЭ АДНА «ЗВЯЗДОЎСКАЯ» ПЕРАМОГА

Рэдакцыя газеты «Звязда» разам з аглядальнікам «Народнай газеты» Нінай Яновіч падзяліла II месца ў Рэспубліканскім творчым конкурсе сярод друкаваных СМІ на лепшае асвятленне тэматыкі гісторыі і сучаснасці беларускага праваслаўя. Гэта высокая ацэнка работы ўсяго калектыву, бо на суд былі прапанаваны матэрыялы многіх аўтараў: Ілоны Іванавай, Анатоля Клешчука, Яўгена Пясецкага, Марыны Бегунковай, Святланы Яскевіч, Наталлі Талівінскай, Вольгі Мядзведзевай... Гэта былі рэпартажы і фотарэпартажы з падзей, нарысы пра сем'і і асобы, аповеды пра нашу гісторыю і пра новыя з'явы ў нашым грамадстве: нядзельныя школы, садкі з праваслаўным выхаваннем дзяцей, прыходское жыццё...

Дыплом I ступені і першыя прэміі былі ўручаны карэспандэнту віцебскай гарадской газеты «Віцьбічы» Віктару Малашэнку і рэдактару пінскай раённай газеты «Полесская правда» Мікалаю Еленеўскаму за раман-хроніку «Время пастыря» (апублікаваны ў часопісе «Нёман» № 4 за 2007 год). Дыпломы III ступені атрымалі брэсцкая абласная газета «Заря» і журналіст абласной газеты «Магілёўскія ведамасці» Людміла Грышанава. Віншуем калег!

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

ВА УКРАІНЕ ЗНОЎ МОЖА БЫЦЬ УВЕДЗЕНА СМЯРОТНАЕ ПАКАРАННЕ

Ініцыятарам выступіў Камітэт Вярхоўнай Рады Украіны па пытаннях заканадаўчага забеспячэння праваахоўнай дзейнасці.

Дакладчыкі звярнулі ўвагу на тое, што агульная дэкларацыя правоў чалавека не забараняе смяротнае пакаранне, а міжнародным пактам дазваляецца яе выкарыстанне за найбольш цяжкія злачынствы.

РАСІЯ НЕ ПРЫНЯЛА «ЎЛЬТЫМАТУМУ» АБСЕ

Галоўная на сёння інтрыга прэзідэнцкіх выбараў у Расіі вырашылася: АБСЕ адмовілася прысылаць назіральнікаў. Такім чынам Арганізацыя адрэагавала на словы кіраўніка МЗС РФ Сяргея Лаўрова, які назваў патрабаванні БДІПЧ «ультыматумам».

На думку Лаўрова, сітуацыя, якая склалася, «робіць яшчэ больш актуальнай задачу рэфармавання гэтай структуры, каб яна працавала не на падставе вынайдзеных ёй інструкцый, а на падставе калектыўна ўзгодненых на міжурадавым узроўні». Менавіта за гэта даўно ўжо выступае Расія, якая разам з іншымі краінамі СНД, АДКБ унесла адпаведны праект базавых прынцыпаў Арганізацыі па назіранні за выбарамі.

Цікавую ацэнку адмове Парламенцкай асамблеі АБСЕ накіраваць назіральнікаў на прэзідэнцкія выбары ў РФ даў прэзідэнт Фонду эфектыўнай палітыкі Глеб Паўлоўскі. Паводле яго слоў, такі крок можа азначаць пачатак рэалізацыі плана па абвяшчэнні гэтых прэзідэнцкіх выбараў у Расіі нелегітымнымі. Разам з тым Паўлоўскі не выключае, што гэты дэмарш азначае толькі спробу псіхалагічнага ціску на Маскву.

ЦІМАШЭНКА ЗАБАРАНІЛА МІНІСТРАМ І ЧЫНОЎНІКАМ РАЗМАЎЛЯЦЬ З ЖУРНАЛІСТАМІ БЕЗ САНКЦЫЙ?

Усе каментарыі вышэйшых урадавых чыноўнікаў Украіны, у тым ліку заявы міністраў, з гэтага часу будуць праходзіць жорсткае рэцэнзаванне спецслужбаў, сцвярджае штотыднёвік «Дзелавая сталіца». Зменіцца фармат зносінаў са СМІ і прэм'ер-міністра Юліі Цімашэнка.

Інфармацыя ад яе будзе падавацца ў форме маналога галоўным чынам праз дзяржаўныя сродкі масавай інфармацыі. Чыноўнікам больш нізкага звяна ўвогуле катэгарычна забаронена выдаваць інфармацыю журналістам. Верагодна, такім чынам Цімашэнка мае намер выключыць магчымасць абнародавання «непатрэбнай» інфармацыі — грамадскасць будзе ведаць толькі тое, што захоча паведаміць прэм'ер, мяркуе выданне.

АД ТАРНАДА Ў ЗША ЗАГІНУЛІ 55 ЧАЛАВЕК

Колькасць ахвяраў тарнада, якое пракацілася па паўднёвых штатах ЗША 5 і 6 лютага, павялічылася да 55 чалавек. Найбольшая колькасць загінулых ад стыхійнага бедства зарэгістравана ў штаце Тэнэсі, дзе ахвярамі тарнада стаў 31 жыхар, у Арканзасе загінулі 13 чалавек, у Кентукі — сем і ў Алабаме — чатыры.

Праявіўся лік Дзевы Марыі

Лік Прасвятой Багародзіцы Дзевы Марыі, якая аплаквае свайго забітага сына Ісуса Хрыста, толькі што знятага з крыжа, праявіўся на адным са схілаў прамысловага кар'ера «Каменка» ВРУП «Крычаўцэментнашыфер», паведаміў карэспандэнту БЕЛТА вядучы інжынер прадпрыемства па інфармацыйнай рабоце Аляксандр Балдоўскі. Паводле яго слоў, цудоўнае з'яўленне адбылося непадалёк ад святой крыніцы, дзе, верагодна, некалі стаяла праваслаўная каплічка, а магчыма, і цэркаўка. Убачыў і сфатаграфаваў гэта знаменне вадзіцель кар'ернага самазвала Канстанцін Смаляк яшчэ мінулым летам, калі стаяў пасля дажджу пад пагрузкай. У мітусні працы і быту ён забыўся на гэта, не надаўшы асаблівага значэння ўбачанаму. І толькі нядаўна, праглядаючы фатаграфіі, ён натрапіў на выяву журботнага ліку Багародзіцы, які праявіўся на схіле кар'ера. Вадзіцель паведаміў аб гэтым кіраўніцтву прадпрыемства. Па распараджэнні генеральнага дырэктара «Крычаўцэментнашыфера» Мікалая Дудыкі работы каля гэтага мелавога схілу спынены, а таксама прыняты неабходныя меры для захавання Святых лікаў.

Фота БЕЛТА.



Справы партыйныя

Міністэрства юстыцыі адклікае іск аб ліквідацыі ПКБ

Аб гэтым гаворыцца ў паведамленні міністэрства, якое было распаўсюджана ўчора.

У Мінюсце патлумачылі, што 22 студзеня атрымалі ліст з ПКБ, у якім партыя інфармавала аб устараненні парушэнняў, якія сталі прычынай прыпынення летась яе дзейнасці. Міністэрства вывучыла гэтыя дакументы, а таксама матэрыялы органаў юстыцыі на месцах. У выніку было высветлена, што пасля прыпынення дзейнасці ПКБ у партыі была «значна палепшана арганізацыйная праца, у тым ліку рэгістрацыя і пастаноўка на ўлік арганізацыйных структур». А таксама «наведзены парадак ва ўліку членаў партыі і ў вядзенні справаводства».

Такім чынам, ПКБ была праведзена «пэўная праца па ўстараненні парушэнняў заканадаўства рэспублікі і статута партыі», якія мелі месца.

Што датычыцца парушэнняў, якія дапусцілі асобныя прадстаўнікі партыі ў перыяд прыпынення яе дзейнасці, то, паводле слоў кіраўніцтва ПКБ, «яны шчыра памыляліся» і лічылі магчымым рабіць свае дзеянні «без намеру ігнараваць рашэнне суда» аб прыпыненні дзейнасці ПКБ.

Сяргей КУЗНЯЦОЎ.

Памяць

Абаронцы Айчыны пахаваны з усімі ваеннымі ўшанаваннямі

Вялікая Айчынная вайна зноў нагадала аб сваіх ахвярах. 7 лютага на гродзенскіх могілках у Аульсе з усімі ваеннымі ўшанаваннямі, у прысутнасці ветэранаў, кіраўнікоў горада, вайскоўцаў перазахаваны ў брацкай магіле астанкі 361 чалавека. Гэта чырвонаармейцы, якія загінулі ў лагеры для ваеннапалонных, што размяшчаўся ў 1941—1942 гадах на месцы цяперашняга мікрараёна «Фолюш».

Паводле інфармацыі Гродзенскага гарадскога ваеннага камісара Іосіфа Ціса, на чалавечыя астанкі натрапілі падчас земляных работ пры пракладцы водаправода да аднаго з аб'ектаў. Пасля гэтага за працу ўзяліся вайскоўцы 52-га асобнага пошукавага батальёна. Акрамя шматлікіх прадметаў амуніцыі, удалося знайсці шэсць жэтонаў і ўжо вызначаны асобы двух чырвонаармейцаў (абодва — ураджэнцы Украіны) і іх сваякі, якія неўзабаве павінны прыехаць на магілу сваіх блізкіх.

Фота Яраслава ВАНЮКЕВІЧА.

Дарэчы, лічба 361 — не канчатковая. Побач таксама выяўлены астанкі, але гэта месца пакуль законсервавана і пошукавыя работы пачнуцца ў маі.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

Бягляк хаваўся ў зямлянцы ў цэнтры Гомеля

32-гадовы мужчына, які збег з папраўчай установы адкрытага тыпу № 17 Гомеля, дзе адбываў пакаранне за крадзеж, тры месяцы хаваўся ў зямлянцы, якую змайстраваў у цэнтральнай частцы горада — у закінутым тэхнічным памяшканні на земляным схіле каля Сожа за гарадской бальніцай хуткай медыцынскай дапамогі. Ад апоры электраперадач, што непадалёк, ён правёў сабе электрычнасць, дзякуючы чаму меў святло і цяпло, а таксама змайстраваў сігналізацыю, якая папярэджвала аб нязваных гасцях. Жыў за сродкі, зароблены на будоўлі.

Алена САФРОНАВА, БЕЛТА.

Аўцабык забіў служыцеля

ў Каўнаскім заапарку. Некалькі дзесяцігоддзяў таму леапард разарваў работніцу, якая пастаянна яго карміла. Пры падобных абставінах загінуў даглядчык насарога, які быў смяротна паранены рогам жывёлы.

Алена ЮРКЯВІЧЭНЕ, БЕЛТА.

ISSN 1990 - 763X

08025

9 771990 763008

ОАО «Борисовское СМУ» (Продавец) совместно с КУП «Минский областной центр учета недвижимости» проводят открытый аукцион

по продаже бетонно-растворного узла (общ. пл. 706 кв.м) и устройства для выгрузки цемента, расположенных: г. Борисов, ул. Демина, 13. Площадь земельного участка — 0,2341 га. Начальная цена 161 660 000 бел. руб с НДС. Задаток в размере 10 % от начальной цены перечисляется на р/с № 3012020200010 в Октябрьском отделении ОАО «БПС-Банк», МФО 153001357, КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015. Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 дней с даты проведения аукциона. Объекты продаются без условий. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится 11.03.2008 г. в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 321. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 10.03.2008 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326.

Контактный телефон (8017) 2246134
Сайт в Интернете: www.rlt.by

КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015.

КУП «Минский областной центр учета недвижимости» проводят открытый аукцион

по продаже зданий общей пл. 501 кв.м и 217,0 кв.м, спортзала 302,1 кв.м, котельной 173,6 кв.м, Томковичской средней школы, расположенных: Дзержинский р-н, д. Томковичи. Площадь зем. участка 1,6666 га. Начальная цена — 163 109 000 бел. рублей. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 18.10.2007 г. Аукцион состоится 04.03.2008 г. в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 321. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 03.03.2008 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326.

Контактный телефон (8017) 2246134
Сайт в Интернете: www.rlt.by.

КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015.

ООО «Газстрой» (Продавец) совместно с КУП «Минский областной центр учета недвижимости» проводят открытый аукцион

по продаже производственной базы (здание гаража об. пл. 292 кв.м, здание склада об. пл. 96 кв.м, административное здание об. пл. 156 кв.м), расположенной: г. Узда, ул. К. Маркса, 94. Площадь зем. участка 0,5326 га. Начальная цена — 91 412 000 бел. рублей с НДС. Задаток в размере 10 % от начальной цены перечисляется на р/с № 3012020200010 в Октябрьском отделении ОАО «БПС-Банк», МФО 153001357, КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015. Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 дней после проведения аукциона. Объект продается без условий. Переход права пользования земельным участком будет осуществлен по решению райисполкома. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится 11.03.2008 г. в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 321. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 10.03.2008 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326.

Контактный телефон (8017) 224 61 34.
Сайт в Интернете: www.rlt.by.

УНП 690324015.

КУРСЫ ВАЛЮТ

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 8.02.2008 г. (для б/н разлікаў)

1 долар ЗША	2 149,00
1 еўра	3 140,98
1 латвійскі лат	4 510,44
1 літоўскі літ	909,17
1 чэшская крона	122,59
1 польскі злоты	872,27
1 расійскі рубель	87,19
1 украінская грыўня	424,66

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў

Цэнтрабанк РФ

USD	24,6466
10 UAH	48,3087
1000 BYR	11,4529
EUR	36,0259

Курс у гандлёвых кампаніях (на 7.02.2008 г.)

USD	2135 / 2210

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2008 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.

ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009

Неабходна распрацаваць механізм вызначэння пачатковай цаны аб'екта на аўкцыёне

Такую думку выказала начальнік аддзела па арганізацыі і правядзенню аўкцыёнаў і конкурсаў УП «Мінскі гарадскі цэнтр нерухомай маёмасці» Вольга Сянчук на прэс-канферэнцыі ў Мінгарвыканкаме, каментуючы Указ № 667 «Аб адабранні і прадастаўленні зямельных участкаў», які ўступіў у сілу 1 студзеня 2008 года. Яна паведаміла, што ў 2007 годзе ў Мінску было аб'яўлена тры аўкцыёны на права заключэння дагавораў арэнды зямельных участкаў, на якіх выстаўлялася дзевяць участкаў. Яшчэ адзін аўкцыён, на які былі выстаўлены шэсць зямельных участкаў для будаўніцтва аб'ектаў рознага прызначэння, планаваўся ў студзені гэтага года. Аднак усе ўчасткі не прададзены, прызнана, што аўкцыёны не адбыліся па прычыне адсутнасці заяўніка, канстатавала Вольга Сянчук.

Асноўнай прычынай спецыяліст назвала вельмі высокую пачатковую цану аб'ектаў, паколькі яна вызначаецца на аснове кадастравага кошту зямлі. «Гэта значыць механізм канкрэтнага вызначэння пачатковай цаны да гэтага часу адсутнічае, таму выканкамам пачатковая цана ўстанаўлівалася ў памеры 100 працэнтаў кадастравага кошту», — растлумачыла прадстаўнік Мінскага гарадскога цэнтра нерухомай маёмасці.

У якасці прыкладу яна прывяла заяўлены кошт зямельных участкаў на аўкцыёнах, што не адбыліся. Так, за ўчастак на права арэнды тэрмінам на 50 гадоў плошчай 1,8 га для будаўніцтва многафункцыянальнага культурна-забаўляльнага комплексу ў Мінску на вуліцы Лабанка неабходна было заплаціць $6,9 млн. За ўчастак плошчай 0,9 га на вадасховішчы Дразды для будаўніцтва многафункцыянальнага комплексу «Віктарыя» — $3,3 млн. Самая нізкая цана была заяўлена на аб'ект абслугоўвання насельніцтва па вуліцы Бачылы плошчай 0,3 га — $79,8 тыс.

«Адносна кадастравага кошту зямлі, калі не гаварыць аб пачатковай цане аб'екта на аўкцыёне, гэта цалкам рэальныя лічбы, якія адлюстроўваюць рэальны кошт зямлі, — лічыць Вольга Сянчук. — Але пытанне ў тым, каб урадам быў распрацаваны які-небудзь механізм вызначэння пачатковай цаны аб'екта на аўкцыёне, каб тым самым зрабіць аб'ект максімальна прывабным для інвестара».

БЕЛТА.

Дзярждума ратыфікавала пагадненне аб парадку аказання меддапамогі

Дзярждума Расіі ратыфікавала беларуска-расійскае міжурадавае пагадненне аб парадку аказання медыцынскай дапамогі грамадзянам Расійскай Федэрацыі ва ўстановах аховы здароўя Рэспублікі Беларусь і грамадзянам Беларусі ва ўстановах аховы здароўя Расіі.

Згодна з дакументам, беларускія грамадзяне, якія пастаянна пражываюць у Расіі, атрымаюць роўныя з расійскімі грамадзянамі правы на медыцынскую дапамогу. Яе плануецца аказваць па базавай праграме абавязковага медыцынскага страхавання. За беларускіх грамадзян, якія працуюць у Расіі па працоўных і грамадзянска-прававых дагаворах, работадаўцы будуць адлічваць адзіны сацыяльны падатак. Абавязковае медыцынскае страхаванне непрацуючых беларускіх грамадзян аплацяць суб'екты федэрацыі.

У сваю чаргу грамадзяне Расіі, якія пастаянна пражываюць у Беларусі, атрымаюць роўныя правы з беларускімі грамадзянамі на медыцынскую дапамогу, уключаючы бясплатнае лячэнне ў дзяржаўных установах аховы здароўя Беларусі. Расійскім грамадзянам, якія часова пражываюць у Беларусі, згодна з пагадненнем, будзе забяспечана права на атрыманне хуткай медыцынскай дапамогі, а таксама медыцынскай дапамогі ў выпадку ўзнікнення ў іх сацыяльна небяспечных захворванняў.

Прадстаўляючы пагадненне да ратыфікацыі, старшыня камітэта Дзярждумы па справах СНД і сувязях з суайчыннікамі Аляксей Астроўскі адзначыў, што асноўным матывам заключэння дакумента стала «імкненне да развіцця расійска-беларускага супрацоўніцтва ў галіне забеспячэння роўных умоў доступу да медыцынскай дапамогі ва ўстановах аховы здароўя Беларусі і Расіі».

У сваю чаргу намеснік міністра аховы здароўя і сацыяльнага развіцця Расіі Уладзімір Старадубаў растлумачыў, што ў пагадненні ўлічаны разыходжанні, якія існуюць у дзвюх краін у арганізацыі сістэм медыцынскага страхавання.

Дакумент быў падпісаны на пасяджэнні Вышэйшага Дзяржсавета Саюзнай дзяржавы ў Санкт-Пецярбургу 24 студзеня 2006 года. Пагадненне заключана тэрмінам на пяць гадоў і прадугледжвае аўтаматычнае прадаўжэнне на наступныя пяць гадоў у выпадку, калі бакі не маюць намеру яго спыняць. Беларускі бок ужо завяршыў усе ратыфікацыйныя працэдуры па дакументу.

БЕЛТА.

Беларусь вітае далучэнне Украіны да СГА

Рэспубліка Беларусь вітае далучэнне Украіны да Сусветнай гандлёвай арганізацыі і адзначае значную работу, праведзеную Украінай у ходзе складаных і працяглых перагавораў з краінамі — членамі СГА. Аб гэтым гаворыцца ў каментарыі прэс-сакратара МЗС Беларусі Андрэя Папова ў сувязі з паступаючымі ад прадстаўнікоў СМІ пытаннямі адносна зацвярджэння 5 лютага Генеральным саветам СГА рашэння аб прыёме Украіны ў склад членаў гэтай міжнароднай арганізацыі.

На думку Беларусі, з прыёмам Украіны ў свае рады СГА зрабіла яшчэ адзін крок да таго, каб стаць сапраўды ўніверсальнай міжнароднай арганізацыяй. «Мы перакананы, што ўступленне аднаго з важнейшых гандлёвых партнёраў Рэспублікі Беларусь у СГА стварае ўмовы для яшчэ больш дынамічнага развіцця ўзаемавыгаднага гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва паміж нашымі дзяржавамі, заснаванага на прынцыпах і нормах міжнароднага права і дзеючых міжнародных дагавораў, бакамі якіх з'яўляюцца Рэспубліка Беларусь і Украіна», — падкрэсліў прэс-сакратар МЗС.

БЕЛТА.

Уступленне Украіны ў СГА можа адбіцца на развіцці яе эканомікі

Такі пункт гледжання выказаў намеснік міністра эканомікі Беларусі Андрэй Тур.

Ён адзначыў, што «гаварыць на гэту тэму сёння можна толькі канцэптуальна, паколькі мы не ведаем усіх умоў, па якіх ажыццяўлялася ўступленне Украіны ў СГА». З улікам тэхнічнага ўзроўню, ступені зношанасці абсталявання, якасці і цэнавага фактару выпускаемай прадукцыі Украіна можа страціць на пэўны перыяд часу свой унутраны рынак. Як вынік — і знешні таксама. І калі раней Украіна магла выбраць і пастаўляць недастаткова якасную прадукцыю ў Беларусь або Расію, то цяпер сітуацыя для яе зменіцца не ў лепшы бок. Любая краіна імкнецца ўвайсці ў СГА па дзвюх прычынах. Калі ў яе вельмі высокі тэхнічны ўзровень або наадварот — тэхнічны ўзровень ніжэйшы, але ёсць кваліфікаваная рабочая сіла. Але другі варыянт яшчэ не азначае, што «гэта кваліфікаваная рабочая сіла можа быць выкарыстана на Украіне». Не выключана, што Еўрасаюз можа выкарыстоўваць яе і ў сваіх інтарэсах. «І ад гэтага Украіна не выйграе», — лічыць Андрэй Тур. Тое ж адбылося і з іншымі краінамі СНД (Малдова, Кыргызстан, Грузія), якім уступленне ў СГА нічога не дало.

БЕЛТА.

Як Аўгустоўскаму каналу трапіць у Спіс сусветнай спадчыны?

У беларусаў і палякаў нямала агульных клопатаў па захаванні аб'ектаў гісторыі і культуры. Таму наспеў час аднаўлення сумеснай кансультацыйнай камісіі па справах гісторыка-культурнай спадчыны. Аб гэтым ішла размова на сустрэчы пасла Беларусі ў Варшаве Паўла Латушкі з намеснікам міністра культуры і нацыянальнай спадчыны Польшчы Томашам Мертай. Яны, у прыватнасці, дамовіліся аб працягу сумесных намаганняў па ўнясенні Аўгустоўскага канала ў Спіс аб'ектаў сусветнай спадчыны ЮНЕСКА. Гутарка таксама ішла аб супрацоўніцтве пры рэстаўрацыйных работах у Нясвіжскім замку Радзівілаў, удзеле палякаў у аднаўленні былога радавога фальварка Напалеона Орды ў Іванаўскім раёне, святкаванні 210-ай гадавіны з дня нараджэння Адама Міцкевіча, магчымасці адкрыцця помніка класікам беларускай літаратуры Янку Купалу і Якубу Коласу ў Варшаве.

Леанід ТУГАРЫН.

ОАО «Управление механизации № 79» извещает своих акционеров о проведении 14 марта 2008 года очередного собрания акционеров

ПОВЕСТКА ДНЯ:

1. О финансово-хозяйственной деятельности Общества в 2007 году и основных направлениях деятельности Общества в 2008 году.
2. Утверждение годового отчета и баланса Общества.
3. О распределении чистой прибыли за 2007 г. и выплате дивидендов за 2007 г.
4. Утверждение использования чистой прибыли Общества на 2008 г.
5. Отчет Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии о работе в 2007 г.
6. Утверждение условий материального вознаграждения членов Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии.
7. Избрание членов Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии.
8. Об оказании Обществом в 2008 г. — I квартале 2009 года безвозмездной (спонсорской) помощи.

Место проведения собрания: Дворец молодежи и школьников «Орион» (г. Минск, ул. Бачило, д. 1, микрорайон Шабаны).

Время начала проведения собрания — 17.15.

Время регистрации участников собрания: в день проведения собрания с 15.30 до 17.00 по предъявлению документа, удостоверяющего личность, а представителей акционеров — и доверенности.

Наблюдательный совет.

УНН 100090613

Пасля пісьма: расследаванне

«ДАСТУКАЦЦА ДА НЯБЁСАЎ»,

або Найноўшая гісторыя аднаго канфлікту мясцовага значэння

У гэтым пад'ездзе дагэтуль жывуць людзі, бегаюць дзеці...

У лютым 2006 года ў кватэры №16 дома №10 у Ваенным гарадку Плешчаніц пасля цяжкай працяглай хваробы памёр гаспадар. Праз 40 дзён, справіўшы трызну, удава Любоў Д'якава, паехала да сына ў Варкуту на астатак вясны і лета. У акружэнні блізкіх лягчэй справіцца з непапраўнай стратай. Ніхто тады яшчэ не ведаў, што такім чынам, магчыма, было выратавана адно жыццё і, як ні па-блюзнерску гэта прагучыць, своечасова спынілася іншае. Бо якраз у сярэдзіне ліпеня ў пакоі, дзе зусім яшчэ нядаўна ляжаў бездапаможны хворы чалавек, звалілася столевая бэлька. Яна перабіла ложак напалам, нібы разрэзала нажом.

Так як гаспадыня яшчэ не вярнулася, суседзі, пачуўшы, як здрыгануўся іх 18-кватэрны дом, не адразу даведаліся, што здарылася. Праз тры дні зяць Любові Аляксандраўны ўвайшоў у кватэру і ўсё ўбачыў. Здарэнне ўзрушыла ўсіх жыхароў дома. Яны разумелі: ахвяраў удалося пазбегнуць выпадкова. Бэлька і столь над спальняй 16-ай кватэры не могуць быць адзіным небяспечным месцам у будынку, які пабудаваны ў 1937 годзе і ні разу (!) не рамантаваўся.

Увечары таго ж дня ўсе жыхары дома №10 пад роспіс атрымалі паведамленне, у якім РУП «Лагойскі камгас» у мэтах бяспекі настойліва рэкамендаваў ім часова з'ехаць да сваякоў. «У выпадку неабходнасці, — значылася ў паведамленні, — РУП «Лагойскі камгас» сумесна з Плешчаніцкім пасялковым выканкамам гатоў прадаставіць вам часовае месца пражывання».

Па сутнасці гэтыя паперкі былі саломкай, якую камгас падсцілаў для сябе на выпадак, калі наступная бэлька трапіць у чалавека. У ліпені 2006 года з'ехала толькі шматдзетная сям'я з 17-ай кватэры — да бабулі. Абяцанне прадаставіць часовае месца пражывання было часткова выканана... ажно ў жніўні 2007 года. Праз 13 месяцаў пасля абрушэння бэлькі! І тое, у дачыненні толькі да васьмі сем'яў. Яшчэ дзве ў доме не пражывалі. Восем сем'яў жывуць там дагэтуль! Прычым дзве — шматдзетныя, з зусім маленькімі дзецьмі, якіх не тое што бэлька, кавалак тынкоўкі можа забіць альбо пакалечыць.

Тое, што з дому дагэтуль не ўсе выселены — толькі адзін штрых у дзіўнай плешчаніцкай гісторыі ўзаемаадносінаў людзей і мясцовай улады.

Трэба сказаць, што людзі, якім на галовы падала столь, не сядзелі склаўшы рукі ў чаканні, калі дзяржаўныя чыноўнікі вырашаць больш важныя справы. Яны адносілі пісьмы з фатаграфіямі, самі прыходзілі на прыём да старшыні Лагойскага райвыканкама, шукалі арганізацыю, якая пагадзіцца тэрмінова правесці тэхнічную экспертызу дома, зноў званілі і прыходзілі...

Нарэшце, праз паўгода (!) пасля таго, як дом пачаў рушыцца, 21 студзеня 2007-га, на сустрэчу з жыхарамі дома прыйшлі прадстаўнікі мясцовай улады і камунальнай службы. Людзі чакалі, што «гаспадары горада» прыйшлі паведаміць ім пра тое, калі іх дом пачнуць рамантаваць, колькі часу гэта будзе доўжыцца і дзе яны будуць у гэты час жыць. Але начальства прыйшло не для гэтага.

Размову пачаў дырэктар камгаса Уладзімір Федаровіч з паведамлення, што на 2007 год прадпрыемству выдзелена на рамонт 190 млн беларускіх рублёў. Маўляў, нават калі ўсе гэтыя грошы будуць аддадзены на 10-ы дом, то спатрэбіцца яшчэ 15 гадоў, каб давесці яго да ладу.

Пасля гэтага ён прадэманстраваў спіс пустых кватэр, у якія, на яго думку, маглі перасяліцца жыхары 10-га дома. Былі ўзгаданыя і кінутыя дзесяцігоддзі таму прыватныя домікі. Але тут умяшаўся старшыня пасялковага выканкама Уладзімір Казакоў. Паглядзеўшы на прапанаваны Федаровічам спіс, ён прамовіў: «Ніводнай свабоднай кватэры няма. Гэтыя — усе прыватызаваныя». На тым размова і скончылася. Людзі разышліся ў яшчэ большай разгубленасці, чым знаходзіліся апошнія паўгода.

Яшчэ адна важная дэталь у гэтай гісторыі. Жыхары дома, якія не без падстаў увесь гэты час баяцца за сваё жыццё і жыццё сваіх дзяцей, але не ведаюць, куды падзецца, своечасова не атрымлівалі поўнай і праўдзівай інфармацыі аб сваім доме непасрэдна ад уладаў. У камгасе ім адказвалі, што пакуль няма тэхнічнай экспертызы, справа не зрушыцца з месца, між тым ад праектнай арганізацыі жыхары даведваліся, што такая экспертыза даўно ўжо гатовая і выслана. У выніку людзі згубілі давер да ўлады, і яшчэ на пачатку мінулага года зразумелі, што да іх праблемы нікому няма справы.

Але размова ішла не пра нейкі капрыз, а пра самае надзённае: бяспеку для жыцця і жыллё.

Дом № 10 у мікрараёне Ваенны гарадок у Плешчаніцах. Будаўнічае смецце ляжыць тут з верасня, а ў адрамантаваны пад'езд па-ранейшаму страшна ўвайсці.

У лютым мінулага года на чарговым прыёме ў старшыні райвыканкама яны пачулі ад Івана Магера распараджэнне, якое той даў юрысту: «Рыхтуйце дакументы на фінансаванне дома...».

«На працягу 8 месяцаў, якія папярэднічалі жніўню, — паведамлялі ў сваім лісце ў рэдакцыю «Звязды» жыхары старога даваеннага дома, — *старшыня райвыканкама на ўсе звароты да яго даваў адзін адказ: пры атрыманні праекта будзе аб'яўлены тэндар арганізацый, якія маюць ліцэнзію на выкананне такіх работ, потым раён звернецца ў вобласць па грошы. Але!!! 27 жніўня 2007 года райвыканкам пачаў адсяленне жыхароў (гэта тры сям'і самага небяспечнага пад'езда). Да 1 верасня 2007 года былі знойдзены 3 хлапчукі 18—20 гадоў, якія прыступілі да рамонту даху.*

На пытанні пра назву фірмы, ці азнаёмленыя яны з тэхнічным заключэннем, з праектам, было маўчанне. Але самае цікавае, што гэтыя стойкія хлопцы без праекта, без адзінкі тэхнікі, толькі ручная праца, за 26 дзён закончылі «капітальны рамонт дома з частковай аддадзянай», пра што намеснік дырэктара камгаса паведаміла праз раённую газету «Родны край».

Артыкул у раёнцы з'явіўся нават раней — 19 верасня. І называўся ён «Куда уходят деньги?». Аўтар тлумачыла, куды выкарыстоўваюцца адлічэнні кватэранаймальнікаў па графе «капітальны рамонт». У якасці прыкладу яна прывяла дом № 10 у мікрараёне Ваенны гарадок г. п. Плешчаніцы, у якім «завершаны капрамонт з частковай мадэрнізацыяй».

Наш чалавек, скажу я вам, прывыклы да рознага. Але каб так...

Прайшло больш за год пасля таго, як у адным старым доме прыгожага калісьці сапраўды квітнеючага, г.п. Плешчаніцы, прабіла столь і ложак гнілая бэлька. Васемнаццаць сем'яў, якія пражывалі ў тым доме, у лістападзе атрымалі тлумачэнне ад генеральнага дырэктара Мінскага абласнога ўнітарнага прадпрыемства «Управленне жыллёва-камунальнай гаспадаркі» спадара Жураўскага наконт «недакладнасці» ў раённай газеце. «У той жа газеце ад 26 верасня, — паведамляў генеральны дырэктар, — надрукавана абвяржэнне, у якім указана, што рамонт дома не завершаны». Уся штука была ў тым, што капрамонт не быў і пачаты.

У адчаі людзі пачалі пісаць і звяртацца па дапамогу ўсюды.

У тым ліку ў парламенцкую Камісію па жыллёвай палітыцы, будаўніцтве, гандлі і прыватызацыі.

— Я сама — архітэктар па прафесіі, таму, выслухаўшы людзей, паехала ў Плешчаніцы, каб убачыць усё на свае вочы, — расказала «Звяздзе» намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Галіна ПАЛЯНСКАЯ. — Я запрасіла таксама дэпутата па гэтай акрузе Алену Скрыпко, чалавека ўважлівага да патрэб свае выбаршчыкаў. На месцы мы ўпэўніліся, што ўсё, пра што расказалі жыхары дома, чыстая праўда. Частка жыльцоў дома сёння выселеная, а частка пражывае ў ім. Тыя работы, якія былі выкананы восенню 2007 года, — замена часткі даху і столі — праведзены без праектна-каштарыснай дакументацыі. Яна дагэтуль знаходзіцца ў Маладзечне, у ЗАТ «Будпраект». Дагэтуль не аплачана. А без праекта ўсялякая работа, якая праводзіцца пад маркай капітальнага рамонту, не з'яўляецца такой. Тое, што было зроблена з домам — толькі выгляд праведзенага рамонту. Дом у Плешчаніцах у жахлівым стане, горш за ўсё тое, што там дагэтуль жывуць людзі, нават маленькія дзеці. Знаходзіцца там небяспечна. І, на маю думку, рабіць яго капітальны рамонт з мадэрнізацыяй не рацыянальна. Там можна пакінуць цагляныя сцены, а ўсё астатняе трэба разабраць і зрабіць наноў. Па каштарыснай вартасці цана квадратнага метра складзе 500 долараў. Для параўнання: у Мінску кошт квадратнага метра капрамонту не перавышае 200 долараў. Лічыцца, калі дом патрабуе большых затрат, то больш выгадна даць людзям новыя кватэры. Сапраўды, будаўніцтва новага жылога дома, асабліва ў Плешчаніцах, абыдзецца больш танна. Зараз ёсць вельмі добрыя праекты.

— Натуральна, усе нарматывы па прадастаўленні кватэр тут павінны быць улічаны, — падкрэсліла дэпутат. — Выселеным сем'ям сёння далі часовае жыллё, якое не разлічана па плошчы на склад гэтых сем'яў. Мне было дзіўна пачуць, калі мясцовыя ўлады на сустрэчы з жыльцамі дома, спыталі іх, ці згодныя яны застацца ў гэтых кватэрах назаўсёды. Людзі вымаганыя няўпэўненасцю і чаканнем, прапанаваць ім гэтакі варыянт без права выбару — грубае парушэнне закона.

Пасля наведвання Плешчаніц дэпутаты сустрэліся са старшынёй райвыканкама Іванам Іванавічам Магерам. «Я сказала, што людзей нельга трымаць у невядомасці, — пераказала сутнасць размовы Галіна Палянская. — Праект дагэтуль не аплачаны. Па сутнасці, жыхароў дома падманваюць... Старшыня пагадзіўся з намі, што найбольш мэтазгодна будзе будаваць новы дом, які не толькі абыдзецца ў меншую суму, але і даўжэй праслужыць людзям. Да таго ж, можна будзе пабудаваць дом на большую колькасць кватэр і забяспечыць жыллём тых, хто мае патрэбу».

— Капітальны рамонт правадзіць там сёння немэтазгодна, — на другі дзень пасля сустрэчы з дэпутатамі, 17 студзеня 2008 года, пацвердзіў «Звяздзе» старшыня райвыканкама Іван МАГЕР. — Гэта не па-дзяржаўнаму — укладаць такія грошы ў рамонт будынка. Выканкам прыняў рашэнне аб будаўніцтве дома па артыкуле «старое жыллё». Управленне капітальнага будаўніцтва распрацоўвае праектна-каштарысную дакументацыю для ўключэння дома ў будаўніцтва ўжо ў гэтым годзе. Колькі на гэта спатрэбіцца грошай — яшчэ пралічваецца, але ва ўсякім разе гэта будзе больш танна, чым капітальны рамонт. Сёння пытанне нумар адзін — дом рассяліць.

Добра, калі ўсё так і будзе. Але няўжо за 19 месяцаў нельга было знайсці выйсце, каб не трымаць сем'і з дзецьмі ў аварыйным будынку, і ўсіх жыльцоў дома ў няўпэўненасці?

Што перашкаджала прыняць гэта рашэнне не ў 2008-ым, а ў 2006 годзе? Іван Магер сказаў: «Нам трэба было пацвярджэнне кампетэнтных асобаў». Выходзіць, калі б жыхары дома не прыйшлі ў Палату прадстаўнікоў, і дэпутаты не выказалі свайго меркавання, выйсце так і не было б знойдзена?

Між тым у райвыканкаме яшчэ ў кастрычніку 2006 года падпісалі рашэнне дазволіць праектныя работы па капітальным рамонце. Чаму яшчэ тады не ўзнікла пытанне аб параўнанні кошту капрамонту і будаўніцтву новага дома?

Людзі крыху акрыялі надзеяй пасля ўвагі да сябе з боку парламентарыяў, але праз два тыдні зноў атрымалі «халодны душ». Ім прыйшоў чарговы адказ на чарговы зварот, у якім размова ідзе ўжо не пра капітальны рамонт, і не пра новы дом, а пра рамонт — бягучы.

«Каб падтрымаць дом у спраўным стане, Лагойскім райвыканкамам было прынята рашэнне правесці бягучы рамонт даху», — адказвае жыхарам Плешчаніц (увага! Тут самае цікаўнае!) генеральны дырэктар Камунальнага ўнітарнага прадпрыемства па праектаванні, рамонце і будаўніцтве... дарог «Мінскаблдарбуд». — РУП «Лагойскі камгас» быў заключаны дагавор падраду з ПУП «Акропаліс». Асноўная частка жыльцоў дома на час рамонту адселена. На сёння выканана работ па бягучым рамонце даху на суму 44,12 млн рублёў»

Тут трэба спыніцца на двух акалічнасцях. Першае, што тычыцца падтрымкі дома ў належным стане. Гэта трэба бачыць. Фатаграфіі адлюстроўваюць толькі малую частку тых жудасных умоў, у якіх жывуць людзі. Там, дзе заменена столь, дошкі ўжо пачынаюць чарнець ад цвілі. Над другой паловай дома дах як быў дзіравы, так і застаўся. Ды і пакладзены дах мае шчыліны. На гарышчы стаяць тазы з замерзлай вадой. Некалькі бэлек заменена, але большасць такія ж гнілыя, як тая, што нарабіла бяды. Куча будаўнічага смецця закрывае палову акна на першым паверсе. Дзіркі ў сценах, столі, падлозе. Руйнуюцца лесвічныя канструкцыі, дзвярныя і аконныя праёмы... У такім будынку не тое, што жыць, там знаходзіцца без касак небяспечна.

Другое. Я спытала выканаўцу пісьма: якое дачыненне «Мінскаблдарбуд» мае да жылога дома. Мне шчыра прызналіся: ні-я-кіх. Пісьмо было распісана на іх, і дазвалося адказваць, для чаго проста звялі адказы з раёна і камгаса. Яны — дарожнікі, жылымі дамамі не займаюцца ў прынцыпе.

Сёння людзі ў Плешчаніцах амаль згубілі надзею на тое, што іх праблема будзе вырашана. Але павінен жа быць сродак прымусіць тых, ад каго гэта залежыць, звярнуць, нарэшце, на людзей увагу. Папярэдзіць бяду. Забяспечыць чалавечымі ўмовамі для жыцця. Няўжо і сапраўды гэта тое ж самае, што крычаць у нябёсы?

«Нябёсы» тут — толькі моўны абарот. Бо на самой справе яны адгукаюцца. У адрозненне ад людзей.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.



Яўгенія ВОРАНАВА спадзяецца толькі на тое, што Бог беражэ яе і траіх яе дзяцей ад бяды кожны раз, калі яны праходзяць у дзверы сваёй кватэры.

Каталіцкая царква за перасадку органаў, але супраць кланіравання чалавека

Аб гэтым на анлайн-канферэнцыі заявіў Архіепіскап Мітрапаліт Мінска-Магілёўскі Тадэвуш Кандрусевіч.

«Каталіцкая царква станоўча ставіцца да перасадкі чалавечых органаў, таму што жадае дапамагчы хвораму», — сказаў мітрапаліт. Але, з іншага боку, нельга садзейнічаць смерці іншага чалавека дзеля атрымання органа для перасадкі, дадаў ён. Генетыка дае магчымасць адкрываць і распрацоўваць новыя медыкаменты або спосабы лячэння.

Аднак каталіцкая царква катэгарычна супраць кланіравання чалавека, падкрэсліў ён. «Чалавек — непаўторнае Божае тварэнне. Таму каталіцкая царква супраць выкарыстання стваловых клетак чалавечых эмбрыёнаў, — адзначыў мітрапаліт. — Эмбрыён — гэта чалавек. Акрамя таго, выкарыстанне чалавечых эмбрыёнаў часта звязана з іх замарожваннем і наступным знішчэннем, што само па сабе амаральна». У той жа час каталіцкая царква падтрымлівае выкарыстанне стваловых клетак, якія атрымліваюцца не з эмбрыёнаў, а напрыклад, са скурнага покрыва, заявіў Тадэвуш Кандрусевіч.

БЕЛТА.

Погляд

«Польскаму сантэхніку» шукаюць замену ў Беларусі?

Як паказаў час і падзеі (той жа правал Еўраканстытуцыі) — «адзіная Еўропа» не такая ўжо і адзіная. Навабранцы Еўрасаюза з Усходняй Еўропы — галодныя і ад таго больш спрытныя — пацягнулі на сябе не толькі палітычную коўдру ў важных міжнародных пытаннях з разамлелых апалагетаў еўраідэі Германіі і Францыі. Задоўга да адкрыцця граніц стары свет атрымаў удар у выглядзе новай хвалі працоўнай іміграцыі — ужо ўсходнееўрапейскай, і сціснуўся ў чаканні ліквідацыі шлагбаумаў. Не дарэмна.

Калі перафразаваць класікаў марксізму-ленінізму: сёння здань «польскага сантэхніка» ўжо блукае па Еўропе». Прычым па Заходняй. Яна гатова працаваць больш і за меншыя грошы. І вось тут простыя парыжане ці берлінцы сутыкнуліся з тым, што паліткарэктнасць і заявы палітыкаў пра агульнаеўрапейскую сям'ю — гэта адно, а рост беспрацоўя сярод абарыгенаў і змяншэнне заробкаў — зусім іншае. Тут бы ўласныя сем'і пракарміць...

Аднак гэта яшчэ не ўсе наступствы. Другі канец міграцыйнай дубіны балюча ўдарыў... па самой Польшчы. Вялікая колькасць высока і не вельмі кваліфікаванай працоўнай сілы без шкадавання пакінула бацькаўшчыну ў пошуку «доўгага еўра». Усяго каля мільёна чалавек. Хто на час, а хто і назаўсёды. Даволі востра палякі гэта адчулі, калі, прабачце, не стала каму выносіць вуткі ў бальніцах і рамантаваць сантэхніку. Паводле слоў аднаго польскага чыноўніка, яго краіна штогод мае патрэбу ў 500 тысячах іншаземных рабочых. Натуральна, не на кіруючых пасадах: клубніцы збіраць ды цэглу класці. Ну ці як напісана вышэй. Выратоўваючы сітуацыю, бацькі нацыі прынялі пастанову ўрада, якая дазволіла выхадцам з Украіны, Расіі і Беларусі працаваць «ва ўсіх сектарах» нацыянальнай эканомікі. Аднак ці то ўмовы працы-аплаты на пана не задаволілі ўсходніх суседзяў, ці то, як у Беларусі, ім і дома заробкаў на хлеб з маслам хапае, але і гэта не поўнасцю вырашыла праблему дэфіцыту працоўных рук.

Вось тут пачалося самае цікавае. Калі матэрыяльныя стымулы аказаліся няслушнымі, эканамісты адышлі ўбок, саступіўшы месца ідэолагам. Нехта прапанаваў «ціснуць» на нацыянальную самасвядомасць палякаў, якія жывуць за мяжой. Маўляў, «хто ты естас?» Радзіма пра цябе не забылася...

22 сакавіка ўступіць у сілу заканон «Аб карце паляка», падпісаны прэзідэнтам Польскай Рэспублікі Лехам Качыньскім мінулай восенню. Гэта карта (пасведчанне) дасць жыхарам Усходняй Еўропы польскага паходжання (калі яны змогуць яго даказаць і прадэманстраваць веданне мовы) некаторыя льготы на тэрыторыі Польшчы. Сярод бонусаў — магчымасць атрымання адукацыі, медыцынскай дапамогі, бясплатнае наведванне музеяў і... магчымасць легальна працаваць. Згодзен з тымі аналітыкамі, якія сумняваюцца, што пры выдачы карты консульства аддасць прыярытэт набожным бабулькам са 100-працэнтным польскім паходжаннем і чатырма класамі яшчэ польскай школы... Хутчэй пасведчанне атрымаюць здаровыя маладыя людзі, якія здольныя папрацаваць на карысць сваёй «радзімы», што раптоўна невядома адкуль аб'явілася.

Маральны бок пытання — фактычна ўвядзенне графы «нацыянальнасць», за якую дэмакратычны Захад увесь час крытыкаваў былы СССР — пакінем на сумленні сённяшніх кіраўнікоў Польшчы. Але ж не факт, што і за льготы ўдасца прыцягнуць у краіну работнікаў з Гарадзеншчыны, Брэстчыны, Віцебшчыны... Пры ўсёй павазе да этнічнай годнасці, новыя пакаленні беларускіх палякаў нарадзіліся ў іншай краіне, тут іх дамы, сем'і, сябры, работа. Тут іх нікто не выдзяляе ні па нацыянальнасці, ні па рэлігіі. Тут іх святы прызнаныя і зацверджаныя дзяржавай, а іх дзеці свабодна могуць вывучаць мову продкаў і знаёміцца з іх культурай... Прабачце за высокія словы, але, па-мойму, гэта і называецца Радзімай.

Дарэчы, такі даволі важны фактар у свой час не ўлічыла і Літва, калі, ратуючыся ад павальнай эміграцыі сваіх грамадзян на Захад у пошуках лепшай долі, схапілася як за саломіну за суайчыннікаў за мяжой. Ім таксама наабяцалі цэлы мех, нават кватэры бясплатныя выдзелілі... Закончылася ўсё вельмі прадказальна: людзі прадалі атрыманае жыллё і вярнуліся на Радзіму. Цяпер, паводле слоў адной радыкальна настроенай літоўкі, каб зрабіць рамонт кватэры ў Вільнюсе, нават маючы грошы, трэба адстаяць у чарзе 2—3 гады, а «хуткую» выклікаць часам проста бессэнсоўна...

Не думаю, што ідэолагі «карты паляка» пра гэта не ведаюць. А калі так, значыць за ўсімі гэтымі «танцамі з бубнам» можа стаяць не толькі відавочная мэта. Разгледзець яе паспрабуем у адным з наступных матэрыялаў.

Уладзімір АЛЯКСАНДРАЎ.

Спорт-тайм

Першы трафей Штанге

Беларуская нацыянальная зборная заняла першае месца на міжнародным турніры на Мальце дзякуючы перамозе над гаспадарамі ў заключным матчы спаборніцтваў. Адзіны мяч у сустрэчы супраць мальтыйцаў забіў Максім Рамашчанка на 89-ай хвіліне гульні са штрафнога. Нагадаем, што раней каманда Бернда Штанге выйграла ў Ісландыі (2:0) і прайграла Арменіі (1:2).

Дарэчы, у Турцыі беларуская «маладзёжка» згуляла ўнічыю ў таварыскім матчы з расіянамі — 1:1. Мяч у нашых забіў паўабаронца Сяргей Крывец.

Зборная ледзь перамагла «палешукоў»

Першы дзень 2-га міжнароднага турніру «Кубак Палесся» ледзь не прынёс першую нечаканасць: у стартавым матчы ў Жлобіне каманда «Палесся», скамплектаваная на аснове ігракоў мясцовага «Металурга» і «Гомеля», аказалася ў кроку ад перамогі над нацыянальнай зборнай. «Палешукі» адкрылі лік (на 44-ай хвіліне вызначыўся Ягор Цурыкаў) і захоўвалі сваю перавагу амаль да заканчэння гульні (вароты надзейна ахоўваў 20-гадовы славацкі легіянер Браніслаў Конрад). Аднак за дзве хвіліны да завяршэння асноўнага часу Аляксей Страхаў устанавіў раўнавагу. Авертайм не вызначыў мацнейшую дружыну. У выкананні пасляматчавых булітаў майстэрства і ўдача аказаліся на баку падначаленых Курта Фрэйзера — 2:1. У Гомелі зборная Даніі разграміла славенцаў — 5:1.

Капэла ўстанавіў для англічан табу

Футбалісты зборнай Англіі святкавалі першую перамогу пры новым трэнеры Фабіо Капэла. У таварыскім паядынку ў Лондане яны перамаглі швейцарцаў з лікам 2:1. Цікава, што італьянскі спецыяліст адразу стаў уводзіць у камандзе новыя правілы. Напрыклад, Капэла забараніў англічанам размаўляць па мабільным у час збораў і мець зносіны са сваімі дзяўчатамі.

СПК «Камено» (Продавец) совместно с КУП «Минский областной центр учета недвижимости» проводят открытый аукцион

по продаже: здания дома животноводов об. пл.152,3 кв.м, здания коровника об. пл. 852,0 кв.м, расположенных: Логойский р-н, д. Заколюжье. Площадь зем. участка 0,8662 га. Начальная цена – 126 791 000 бел. рублей с НДС. Задаток в размере 10 % от начальной цены перечисляется на р/с № 3012020200010 в Октябрьском отделении ОАО «БПС-Банк», МФО 153001357, КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015. Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 дней после проведения аукциона. Объект продается без условий. Переход права пользования земельным участком будет осуществлен по решению райисполкома. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится 11.03.2008 г. в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 321. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 10.03.2008 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326.

Контактный телефон (8017) 224 61 34
**Сайт в

Заснавальнікі — установа «Рэдакцыя газеты «Звязда» і грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Рэгістрацыйны № 12.

8

СТУДЗЕНЯ
2008 г.
ПЯТНІЦА
№ 6 (15510)

ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

ПРЫЯРЫТЭТ — НАЦЫЯНАЛЬНАМУ ЎСЫНАЎЛЕННЮ

У 2007 годзе беларускімі грамадзянамі было ўсыноўлена 532 дзіцяці. Як заўважыла дырэктар Нацыянальнага цэнтра ўсынаўлення Наталля Паспелава, агульная колькасць усыноўленых дзяцей роўная кантынгенту сямі дзіцячых дамоў. І гэта можна лічыць своеасаблівым дасягненнем прайшоўшага ў Беларусі Года дзіцяці.

Для параўнання, у 2006 годзе беларусамі было ўсыноўлена толькі 337 дзяцей. Паводле меркавання Наталлі Паспелавай, павелічэнне на 58 працэнтаў колькасці ўсыноўленых дзяцей стала вынікам як параўнальна простай працэдуры ўсынаўлення, так і росту прафесіяналізму спецыялістаў органаў кіравання адукацыяй, а таксама маштабнай двухгадовай інфармацыйнай кампаніі па актывізацыі нацыянальнага ўсынаўлення ў сродках масавай інфармацыі.

Лідарамі ў перадачы дзяцей на ўсынаўленне сталі Мінская, Гомельская вобласці і сталіца. Найбольшую колькасць усынавіцеляў падрыхтавалі аддзелы адукацыі Барысаўскага, Маладзечанскага, Рэчыцкага, Баранавіцкага райвыканкамаў, а ў сталіцы — Маскоўскага, Фрунзенскага, Савецкага і Першамайскага раёнаў.

Адным з галоўных вынікаў праведзенай інфармацыйнай кампаніі стала ўкараненне ў грамадстве пазітыўных адносінаў да ўсынаўлення. Так, напрыклад, гомельскай абласной тэлерадыёкампаніяй сумесна з упраўленнем адукацыі Гомельскага аблвыканкама, рэгіянальным аддзяленнем Дзіцячага фонду і пры ўдзеле Нацыянальнага цэнтра ўсынаўлення летась была падрыхтавана цэлая серыя праграм, прысвечаных усынаўленню. Усяго па мясцовым тэлебачанні было паказана 17 выпускаў праграмы «Я шукаю матулю» і 27 выпускаў праграмы «Абдымі мяне мацней». Для ўсынаўлення было анансавана каля 40 дзяцей, і практычна ўсе яны былі ўладкаваныя ў сем'і.

— У гэтым годзе нам хацелася б узняць планку ўсынаўлення яшчэ вышэй, тым больш што ў Рэспубліканскім банку даных аб дзецях, якія падлягаюць усынаўленню, маюцца звесткі аб 14 тысячах дзяцей, — падкрэсліла Наталля Паспелава.

Дарэчы, доля міжнароднага ўсынаўлення зведзена ў Беларусі да мінімуму — за апошнія тры гады ў замежныя сем'і былі аформленыя толькі каля 50 беларускіх дзяцей. Прыярытэт аддаецца нацыянальнаму ўсынаўленню...

Надзея НІКАЛАЕВА.

ШЭФСТВА НАД... ЛЕБЕДЗЯМІ

Вучні профільнага класа МНС Дабрамысленскай сярэдняй школы Лёзненскага раёна ўзялі шэфства над лебедзем, што застаўся зімаваць на мясцовым вадасховішчы. Хлопчыкі і дзяўчынкі падкормліваюць гэтую прыгожую птушку.

Чаму засталася яна жыць на вадасховішчы, а не паляцела перазімаваць, невядома. А супрацоўнікі Лёзненскага раённага аддзела па надзвычайных сітуацыях, калі ўдараць моцныя маразы, бяруцца дапамагаць лебедзям не апынуцца ў палоне льдоў на возеры Зяленскае, што кіламетраў за 30 ад райцэнтра. Такім чынам выратавальнікі розных пакаленняў апякаюць крылатых.

Як расказаў «Звяздзе» начальнік Лёзненскага РАНС Аляксандр Сержанкоў, клас МНС быў створаны ў 2006 годзе і стаў самым першым у раёне. Многія з юных выратавальнікаў хочуць стаць прафесіяналамі. І, безумоўна, гэта ў іх атрымаецца, бо сакрэты сваёй будучай прафесіі яны засвойваюць старанна.

А дзеці выратавальнікаў ва ўзросце ад 5 да 16 гадоў нядаўна ўдзельнічалі ў міні-фэсце «Адважным татам», што адбыўся ў раённым Доме культуры. У ліку іншых свае творчыя таленты прадэманстравалі два ўдзельнікі раённага конкурсу «Цуда-дзіця».

Лёзненскія выратавальнікі і самі не без талентаў: вельмі добра гуляюць у футбол. І, выступаючы ў зборнай камандзе Лёзна, выйгралі кубак у футбалістаў Руднянскага раёна Расіі.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.
Лёзненскі раён.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Перапынак!..

У музычным класе сярэдняй школы № 1 горада Горкі.

Рэпарцёр атрымаў заданне...

...ПАБЫВАЦЬ НА ДЫСКАТЭКАХ

У тым сэнсе, каб наведацца туды, паназіраць за моладдзю, паглядзець, якія там парадкі. З тым у выхадны дзень, а дакладней, вечарам у суботу, і адправіўся я ў рэйд па месцах адпачынку моладзі Гомеля разам з намеснікам старшыні камісіі па справах непаўналетніх гарвыканкама Віктарыяй Лапшыной, інспектарамі па справах непаўналетніх аддзелаў унутраных спраў адміністрацый Чыгуначнага і Цэнтральнага раёнаў горада Андрэем Марозавым і Андрэем Белапухавым. Пабывалі мы на дыскатэках і ў маладзёжных клубах «Юнацтва», «Чырвоная спякота», «Плаза», «Цэнтр», «Брава» і «Нэма». Адначасова рэйдавая брыгада, праязджаючы па вуліцах, прыглядвалася да непаўналетніх, і ўжо каля сямі гадзін вечара інспектары склалі пратаколы на трох вучняў адной сярэдняй школы Кірыла Л., Дзмітрыя З. і Кацярыну П., якія знаходзіліся ў стане алкагольнага ап'янення. Пазней за ўчыненне дробнага хуліганства (выказваўся брыдкаслоўем) быў затрыманы 15-гадовы вучань іншай сярэдняй агульнаадукацыйнай школы Павел М. Усе яны будуць выкліканы на адпаведныя камісіі па месцы жыхарства з прыняццем мераў.

Да Палаца творчасці дзяцей і моладзі «Юнацтва» мы пад'ехалі ў пачатку дзевятай гадзіны вечара і адразу заўважылі чатырох непаўналетніх (гадоў пятнаццаці—шаснаццаці) хлопцаў, якія без куртак і шапак стаялі каля будынка і весела размаўлялі паміж сабой. Падумалася, што яны выйшлі астудзіцца на свежае паветра пасля чарговага танца. Але Вікторыя Валер'еўна развеяла маё меркаванне — юнакі выйшлі глытнуць піва, джын-тоніку, а можа, яшчэ і больш моцнага напою. Бо так ужо ў многіх наведвальнікаў менавіта гэтай дыскатэкі павялося. Справа ў тым, што прыходзіць на дыскатэку нападпітку забараняецца. І гэта ўсім вядома. Таму хто-ніхто з аматараў павесяліцца ў абдымках «зялёнага змія» прымяняў рацыяналізацыю: або нейкім чынам праносіў тое спіртное ў памяшканне сам, або прасіў зрабіць гэта сваю сяброўку ці знаёмую. Яно хавалася ў туалеце або ў іншым месцы і пускалася ў ход у патрэбны час. Калі ж гэтыя хітрыкі былі разгаданы, змянілі тактыку: пачалі хаваць свае бутэлькі ў снег, пад дровы і кусты ў Парку культуры і адпачынку імя Луначарскага, дзе знаходзіцца палац. У перапынку паміж танцамі і выходзілі сюды, каб «падсілкавацца» моцным градусам. Дарэчы, тое ж самае, відавочна, робяць і асобныя дзяўчаты, бо некалькі такіх кампаній мне давялося бачыць, калі яны вярталіся на дыскатэку. Праўда, тут ніхто не можа даказаць, што яны, непаўналетнія, менавіта там ужывалі алкаголь, але факт застаецца фактам: у танцавальнай зале і фае былі заўважаны асобы, паводзіны якіх у пэўнай меры былі неадэкватныя, але, як гаворыцца, да наведвання медвыцвярэзніка або складання пратакола за нейкі негатыў «не дараслі». Хоць чаго там... Адзін пратакол аб правапарушэнні, якое на мове юрыстаў матывуецца як дробнае хуліганства, усё ж на гэтай дыскатэцы быў складзены. На семнацацігадовага навучэнца прафтэхвучылішча Аляксандра К., які «праігнараваў» туалет, што маецца ў памяшканні, і «адкрыў» свой персанальны туалет пад сцяной палаца, на ветрыку. Хлопец гэты ўжо два гады таму адбываў пакаранне за рабаўніцтва, а ў мінулым снежні супраць яго была ўзбуджана крымінальная справа па факце непадпарадкавання супрацоўніку міліцыі.

(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)

Пытальнік

Як адправіць дзіця на вучобу за мяжу?

Чулі, што ў пачатку года быў прыняты нейкі новы дакумент, які тычыцца навучання школьнікаў за мяжой. Мы планавалі адправіць сваё дзіця за мяжу, каб «падцягнуць» англійскую мову. У сувязі з гэтым хацелася б даведацца, наколькі прынцыповыя змяненні былі ўнесены ў ранейшы парадак.

А. МІГУН, *г. Гродна.*

Сапраўды, 15 студзеня 2008 года Саветам Міністраў была зацверджана пастанова № 33 «Аб некаторых пытаннях выезду непаўналетніх на навучанне і лячэнне за межы Рэспублікі Беларусь». Да нядаўняга часу існавалі два дакументы, якія рэгламентавалі парадак выезду навучэнцаў за мяжу, аднак ні першы, ні другі дакументы не рэгулявалі пытанні навучання за мяжой дзяцей, якія выязджаюць па ініцыятыве бацькоў. Раней дзеці са звычайных сем'яў маглі выехаць на навучанне за мяжу альбо па накіраванні школ, калі ўстанова мела двухбаковыя сувязі з установамі адукацыі за мяжой, альбо па мэтавым запрашэнні ў складзе творчага калектыву, спартыўнай каманды ці групы, якая з'яўлялася абменнай паміж беларускай установай адукацыі і замежнай. Цяпер жа ранейшыя прабелы ліквідаваныя.

У новым дакументе ўрада выдзелены тры катэгорыі непаўналетніх. Першая — гэта дзеці-сіроты. Другая катэгорыя дзяцей — тыя, што накіроўваюцца за мяжу на навучанне ўстановамі адукацыі. І трэцяя — дзеці, якія накіроўваюцца для навучання бацькамі. Тут таксама могуць быць розныя сітуацыі. Напрыклад, дзіця можа паехаць разам з бацькамі ці з законнымі прадстаўнікамі, калі тыя накіроўваюцца працаваць за мяжу. У гэтым выпадку не спатрэбіцца ні дазвол Міністэрства адукацыі, ні запрашэнне прымаючага боку. Бацькі, якія выязджаюць з дзіцем за мяжу, проста інфармуюць установу адукацыі, дзе навучалася дзіця, аб спыненні навучання ў сувязі з іх выездам, і дзіця адлічваецца са складу навучэнцаў. Калі сям'я вяртаецца ў Беларусь, то дзіця зноў прымаецца ў навучальную ўстанову без ніякіх абмежаванняў ці прывілей.

Другая сітуацыя — дзіця накіроўваецца за мяжу на навучанне без бацькоў. Тут многае будзе залежаць ад узросту дзіцяці. Калі дзіцяці ўжо споўнілася 14 гадоў, то для таго, каб яно магло паехаць за мяжу, дастаткова будзе запрашэння ад навучальнай установы ці заключанага паміж бацькамі і навучальнай установай дагавора. Бацькі павінны прадаставіць ва ўстанову адукацыі, дзе навучаецца дзіця, паведамленне ўстаноўленай формы, пісьмовую згоду дзіцяці, заверануюў яго прысутнасці кіраўніком установы адукацыі ці натарыяльна, копію запрашэння ці дагавора паміж замежнай установай адукацыі і бацькамі. Копія запрашэння ці дагавора павінны быць перакладзеныя на беларускую (рускую) мову і засведчаныя натарыяльна або дыпламатычным прадстаўніцтвам ці консульскай установай Рэспублікі Беларусь.

Бацькі абавязуюцца прыняць неабходныя меры для таго, каб дзіця на працягу месяца пасля свайго ад'езду ў іншую краіну стала там на часовы консульскі ўлік. Да таго ж бацькі павінны атрымаць ад замежнай навучальнай установы дакумент, які пацвярджае, што дзіця прыступіла да вучобы. Калі ж дзіцяці яшчэ няма 14 гадоў, то дадатковых клопатаў пазбегнуць не ўдасца. Дзеці да 14 гадоў могуць накіроўвацца за мяжу для навучання толькі пры ўмове сумеснага знаходжання з законнымі прадстаўнікамі. Праўда, ёсць яшчэ адно выйсце — адправіць дзіця на вучобу за мяжу можна будзе ў тым выпадку, калі паміж бацькамі і замежнай установай будзе заключаны дагавор аб тым, што ўстанова адукацыі бярэ на сябе абавязак забяспечваць поўны пансіён (утрыманне) непаўналетняга. Таксама адправіцца на вучобу за мяжу дзіця ва ўзросце да 14 гадоў можа ў складзе арганізаванай групы з асобай суправаджэння і на тэрмін не больш як 30 дзён.

У тым выпадку, калі будзе ўстаноўлена, што дзіця выехала за мяжу на вучобу без выканання ўстаноўленых патрабаванняў, пытанне ўдзелу бацькоў у выхаванні дзіцяці будзе разглядацца на камісіі па справах непаўналетніх.

Я і Радзіма

ПАДАРУНАК ДА ПАШПАРТА

Прэзентацыя кніг «Беларусь — краіна тваёй будучыні» і «Я — грамадзянін Рэспублікі Беларусь» прайшла ў рамках мінскай міжнароднай кніжнай выставы «Кнігі Беларусі-2008».

Абедзве гэтыя кнігі — сацыяльна важныя праекты выдавецтва «Пачатковая школа», скіраваныя на грамадзянскае і патрыятычнае выхаванне падрастаючага пакалення. Для маладога чалавека шаснаццацігадовы ўзрост — гэта час яго грамадзянскага станаўлення і пошуку жыццёвых арыенціраў. Таму вельмі важна дакладна ўяўляць сабе, у якой краіне ты жывеш, якімі правамі ты валодаеш, якіх законаў павінен прытрымлівацца, якія ідэалы і каштоўнасці беражы.

На старонках маляўніча ілюстраванага вучэбнага выдання «Беларусь-краіна тваёй будучыні» прадстаўлена сістэма дзяржаўнага ўладкавання і нацыянальнай бяспекі Беларусі, інфармацыя аб яе прыродных багаццях, дасягненнях у прамысловасці, сельскай гаспадарцы, культуры, адукацыі і ахове здароўя. Асаблівая ўвага надаецца аўтарамі выдання маладзёжнай палітыцы дзяржавы, канкрэтным мерам па падтрымцы маладых спецыялістаў і маладых сем'яў, як у гарадах, так і ў сельскай мясцовасці. Кніга дапоўнена электронным дадаткам, у якім сабраная ўся заканадаўча-нарматыўная база, якая можа спатрэбіцца маладому чалавеку на жыццёвым старце, прадстаўлены ўсе вышэйшыя і сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы Беларусі, каб ён мог вызначыцца з месцам сваёй будучай вучобы.

Да таго ж напрыканцы 2007 года на заказ Мінадукацыі ў рамках выканання прэзідэнцкай праграмы «Дзеці Беларусі» выдавецтвам «Пачатковая школа» было падрыхтавана і выпушчана тыражом 100 тысяч экзэмпляраў камбінаванае камплектнае выданне «Я — грамадзянін Рэспублікі Беларусь». Гэта адзін з найбуйнейшых выдавецкіх праектаў у Беларусі за апошняе дзесяцігоддзе. Камплект складаецца з кнігі і трох электронных дыскаў, пакладзеных у спецыяльны футляр. Над яго стварэннем працавалі прафесійныя юрысты, сацыёлагі, журналісты і пісьменнікі. Кніга складаецца з сямі частак, тэкст якіх дапоўнены фатаздымкамі і ілюстрацыямі, а таксама афарызмамі, цытатамі, выказваннямі славутых людзей, вершамі і ўрыўкамі з паэтычных твораў.

Электронны дыск «Я і закон» ахоплівае Канстытуцыю, кодэксы і законы Рэспублікі Беларусь, пастановы ўрада, прававыя акты рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання, якія вызначаюць правы непаўналетніх у грамадзянска-прававой і працоўнай сферах, правы моладзі ў нашай краіне, а таксама міжнародныя прававыя акты — Дэкларацыю правоў чалавека, Канвенцыю аб правах дзіцяці і г.д.

У Дыск «Музычныя шэдэўры Беларусі» ўключаны 23 музычныя фрагменты — народныя беларускія песні, класічныя і сучасныя творы беларускіх кампазітараў, якія ўвасобяць у скарбніцу музычнага мастацтва Беларусі. А на электронным дыску «Мастацкія і архітэктурныя шэдэўры Беларусі» прадстаўлены шырокі спектр твораў мастацтва Беларусі IX—XXI стагоддзяў: карціны і абразы, касцёлы і цэрквы, замкі і вежы...

Падарункавы камплект «Я — грамадзянін Рэспублікі Беларусь» будзе ўручацца маладым людзям пры атрыманні пашпарта, што ўзмоцніць грамадзянскую важнасць гэтай падзеі і зробіць яе больш яркай і запамінальнай. У дадзены момант кніга ўжо дастаўлена ва ўсе абласныя і раённыя цэнтры Беларусі.

Надзея НІКАЛАЕВА.

«ФАБРЫКА ЗОРАК» — ТОЛЬКІ СТАРТАВАЯ ПЛЯЦОЎКА

ДАКОТА:



З нядаўняга часу ўсе дзяўчынкі і хлопчыкі, што мараць стаць артыстамі, ведаюць: Дакота — гэта не амерыканскі штат, а наша мінская школьніца, якая мала таго, што трапіла ў папулярны расійскі тэлепраект «Фабрыка зорак-7», дайшла да фіналу, але і паказала ўсім, як у 17 гадоў можна быць мэтанакіраваным і ўпэўненым у сабе творцам. Яе ўпартасць і смеласць нязменна выклікалі павагу. А, безумоўна, трэба быць вельмі смелым чалавекам, каб спяваць свае ўласныя песні на праекце, якім кіраваў адзін з самых папулярных сучасных эстрадных кампазітараў Канстанцін Меладзе. Праект скончыўся, Дакота прыпынілася ў кроку ад прызавога месца, але лічыць, што ўсё — да лепшага. Нядаўна яна завітала ў родны Мінск, далей яе чакаюць — канцэрты і канцэрты.

— Ці не надакучылі вам яшчэ журналісты?

— Не. Проста я лічу, што гэта мая работа, гэта справа майго жыцця — быць артыстам. І інтэрв'ю — гэта яго частка. Як праграмісту ніколі не надакучыць камп'ютар, так і мне гэта ніколі не надакучыць — даваць інтэрв'ю, фатаграфавацца, сустракацца з публікай.

— Дай Бог, каб вы так думалі і праз некалькі гадоў! У вас быў невялічкі адпачынак пасля «Фабрыкі», і у Мінск вы прыязджалі, каб школьныя справы вырашаць?

— Не, я прыязджала, каб сустрэцца з сябрамі, патусавацца. А экзамены за першы трыместр я здала, калі прыязджала на некалькі дзён у снежні. Так што пасля Новага года ў мяне атрымаліся сапраўдныя канікулы. А далей пачынаецца вялікі гастрольны тур з «Фабрыкай зорак», канцэрт за канцэртам па ўсёй Расіі і іншых краінах. Ранейшыя «фабрыканты» — з шостай фабрыкі, з трэцяй, расказвалі мне, як гэта ўсё адбываецца. Няпроста, але мне здаецца, што гэта будзе вельмі цікава. Калі я яшчэ так паезджу па свеце? Прычым наша «Фабрыка» нават у Амерыцы будзе выступаць, гэта ўпершыню так.

— Мне даводзілася неаднойчы чытаць, быццам рэйтынгі ў гэтай сёмай «Фабрыкі» былі самыя нізкія...

— Няпраўда, абсалютная няпраўда! Напрыклад, білеты ў СК «Алімпійскі» расхапілі літаральна за некалькі дзён, білеты на бліжэйшыя канцэрты ў нашым гастрольным туры таксама прададзены, у Прыбалтыцы многія з тых, хто хацеў, не могуць патрапіць. Мне здаецца, што гэтая «Фабрыка» наадварот — самая рэйтынгавая.

— А вы яшчэ не стаміліся ад сваіх калег, з якімі так доўга былі самнасам, адарваныя ад усіх?

— Крышку ёсць. Але цяпер ужо не так цяжка гэта трываць. Таму што можна карыстацца і тэлефонам, і Інтэрнэтам, можна кніжкі чытаць любыя і кіно глядзець, якое хочаш. А на праекце былі забароны нават на некаторыя фільмы. Доктар Курпатаў забараняў глядзець фільмы жахаў, трылеры, псіхалагічныя драмы і пошлыя камедыі. А цяпер у гэтым сэнсе поўная свабода, я магу рабіць што хачу.

— Але акрамя агульнага гастрольнага тура з усімі ўдзельнікамі «Фабрыкі», ці ёсць у вас планы наконт уласнай творчасці, плануеце запісваць новыя песні, дэбютны альбом?

— Падчас тура гэтым складана будзе займацца, аднак творчы працэс у маёй галаве, безумоўна, ідзе няспынна. У мяне ёсць такія маленькія партатыўныя клавішы, таму я змагу прыдумваць песні, музычныя ідэі і захоўваць гэта да пачатку працы ў сапраўднай студыі. На сёння кантракт ва ўсіх удзельнікаў сёмай «Фабрыкі» аднолькавы. Што ў пераможцы Насці Прыходзька, што ў Марка Цішмана, тое і ва ўсіх — гадавы кантракт з кампаніяй «Меладзе бразэрс». Потым з кімсьці кантракт будзе падоўжаны, з кімсьці — не. Пасля заканчэння тура стане вядомы лёс кожнага. Я думаю, гэта будзе залежаць яшчэ і ад таго, як хто праявіць сябе на гастролях. Паглядзім. Але ў сабе я ўпэўнена і не маю намеру спыняцца на дасягнутым, для мяне «Фабрыка зорак» — гэта толькі стартавая пляцоўка. І я не лічу гэта сваёй зорнай гадзінай, усё яшчэ наперадзе. Я дакладна ведаю, што буду рабіць далей і як. У мяне ёсць перавага над іншымі — я сама пішу песні. А мне здаецца, што многія «фабрыканты» не змаглі затрымацца ў музыцы менавіта таму, што ў іх не было добрых песень. А далёка не кожны прадзюсар гатовы пісаць многа якасных песень для людзей, якімі потым не планіруе займацца. Таму мне ў гэтым сэнсе пашанцавала.

— Як вы паставіліся да таго, што не перамаглі, і нават не занялі прызавога месца?

— Ведаеце, мне здаецца, што я заняла першае месца. Таму што калі называюць імя пераможцы, а поўны зал скандзіруе маё імя!.. Я думаю, калі я зарабіла такую сапраўдную любоў публікі, а я ў многіх рэйтынгах была на першым месцы, то я лічу, што гэта і ёсць перамога. І нават на прыкладзе папярэдніх пераможцаў і лаўрэатаў я магу меркаваць, што месца — не галоўнае. Многія з тых, хто на праекце не заняў нічога, цяпер знакамітыя і папулярныя. Тая ж Юля Савічава — выйшла ў фінал, але прызёрам не стала, Саша Балакірава, якая цяпер у складзе групы «Куба», хлопцы з «Чэлсі» сёння ва ўсіх хіт-парадах — а адзін з іх нават да фіналу не дайшоў, Юля Бужылава, якая вядзе выразную арт-хаусную лінію ў шоў-бізнэсе — таксама нічога не заняла. Спіс можна і далей працягваць. А іншыя — той жа Мікіта Малінін, ён перамог, а дзе ён цяпер? Таму я лічу нават карысным, што не мне прысудзілі перамогу. Інакш я магла б падумаць, што гэта ўжо нейкая дасягнутая мэта, вось такая я малайчына — і ўсё! А цяпер у мяне ёсць стымул даказваць усім, што менавіта я была першая, даказваць самой сабе, што я была вартая звання пераможцы. Так што ўсё да лепшага.

— А Канстанцін Меладзе не крыўдзіўся на тое, што вы не выконваеце яго песні?

— Не думаю. Таму што ён ад самага пачатку ведаў, што я хачу паказаць сябе як кампазітар. І ён мне дапамагаў — і аранжыроўкі рабіў, і вучыў мяне ўсяму. Наадварот, ён падтрымліваў мяне ў гэтым памкненні — пісаць свае песні.

— Як і ўсе, вы праспявалі мноства дуэтаў з папулярнымі артыстамі. Які вам самой найбольш спадабаўся?

— Насамрэч кожны такі дуэт для мяне быў як маленькае жыццё, мне пашчасціла папрацаваць не толькі з рознымі выканаўцамі, але нават і з рознымі стылямі — поп, рок, рэгі. Але мой любімы дуэт — з Аляксандрам Іванові з групы «Ронда».

— А як жа Уладзімір Кузьмін? Ён вам і падарунак такі добры зрабіў — гітару, і нават хадзілі нейкія чуткі пра вашы далейшыя сумесныя планы?

— Гэта былі толькі чуткі — што быццам бы я заключыла кантракт з Кузьміным, і ён будзе мяне прадзюсіраваць. Няпраўда. У мяне з ім выдатныя стасункі, ён быў маім такім «фабрычным татачкам». І на Новы год нечакана патэлефанаваў, павіншаваў — было неверагодна прыемна. Ён мой настаўнік, ён разумее тую музыку, што я люблю, і ён мне вельмі дапамог. Але ён музыкант, а не бізнэсмен, таму ні пра якія кантракты нават не ішло гаворкі. Я хачу працаваць з Канстанцінам Меладзе і ні пра што іншае не думаю. А Кузьмін мне сапраўды прапанаваў як-небудзь запісаць разам дуэт, я была б вельмі рада.

— А якое знаёмства вам «падарыла» «Фабрыка», такое, што запомніцца на ўсё жыццё? Я разумею, што першым можна назваць Канстанціна Меладзе...

— Безумоўна. А яшчэ я думаю — гэта Георгій Арамавіч Гаранян, наш выкладчык па джазе. Я калі даведалася, што ён будзе нас вучыць, то ў мяне быў такі прыемны шок. Таму што я вырасла на джазавай музыцы, гэта адзін з маіх любімых стыляў, а Гаранян — легендарная фігура ў джазе, і для мяне быў вялікі гонар з ім разам працаваць. Яшчэ я вельмі палюбіла Міхаіла Баярскага, мне здаецца, ён увогуле паўплываў на ўсё маё жыццё, на маё ўспрыманне свету. Гэта найразумнейшы, наймудрэйшы чалавек. І яшчэ магу сказаць, што дзякуючы «Фабрыцы» я завяла шмат сяброў у шоў-бізнэсе. Я такога проста не чакала, што буду сябраваць з падобнымі людзьмі. Мне здавалася, што там навокал канкурэнцыя, што там тэрарыум, і ўсе хочуць з'есці адзін аднаго. На самай справе, артысты займаюцца кожны сваёй справай, і паміж сабою, як мне здаецца, ім няма чаго дзяліць. Яны абсалютна нармальныя, звычайныя людзі. Я сябрую з Ярыкам Малым з гурта «Токіо», з хлопцамі з «Чэлсі», з дзяўчынкамі з гуртоў «Фабрыка» і «Тутсі», з Максам Пакроўскім, з многімі іншымі. Яны класныя, мы разам з задавальненнем тусуемся.

— А вас можна назваць простай?

— Я думаю, можна. Кажуць, што пасля «Фабрыкі» я наадварот стала яшчэ больш простай і адкрытай. Магчыма, таму, што гэты праект прымусіў мяне асабліва ацаніць тое, што я мела да яго. Часам былі не надта прыемныя сітуацыі, калі я з асаблівым пачуццём успамінала тое, што ў мяне было да гэтага — маіх сяброў, бацькоў, іх любоў да мяне. Я стала больш цаніць дарагіх мне людзей. Адну з песень, што я напісала на праекце, я прысвяціла свайму роднаму чалавеку — дзядулі, якога не стала на гэтым свеце тады, калі я паехала на «Фабрыку». Мне было вельмі цяжка. А паводле кантракта смерць блізкага чалавека адразу цябе выключае з праекта. І мне катэгарычна сказалі — ці я не паказваю нікому свайго няшчасця, ці еду дамоў. Гэта зразумела, таму што там і так вялізная маральная нагрузка, камеры, канкурэнцыя, незнаёмыя людзі. І мне давялося іграць шчаслівую дзяўчынку, калі насамрэч у душы было горка. І гэтую песню я спявала на сваёй другой намінацыі.

— «Фабрыка зорак» для многіх дзяўчынак і хлопчыкаў — запаветная мара. Але ж вы і не глядзелі раней «Фабрыку, і ўвогуле — з зусім іншага свету, іншай музыкі? Навошта тады гэта было патрэбна?

— Так, я з іншай субкультуры, скажам так, і слухаю зусім іншую музыку — панк-рок, хард-рок, вось нешта такое. «Папсу» я ніколі не слухала. Але я расцэньвала «Фабрыку зорак» як унікальную школу майстэрства — вакальнага, кампазітарскага, сцэнічнага, прычым з самымі лепшымі педагогамі СНД. Я ўвогуле туды прыехала, каб паказаць свае песні Канстанціну Меладзе, на большае я і не разлічвала, была ўпэўнена, што мяне выкінуць у першым жа туры. Але тут кажуць — прайшла, прайшла, і раптам — у фінале, і грошай не просяць! Мне было нават дзіка — я і на «Фабрыцы»!

— А праўда не прасілі грошай, таму што ёсць розныя версіі?

— Праўда-праўда. Я ведаю гісторыю, як Меладзе прапаноўвалі 300 тысяч доларaў за месца на «Фабрыцы», а ён адмовіў, і многія багатыя дзеткі не трапілі ў праект. Аказваецца, на самай справе можна было вось так адстаяць чаргу і трапіць у шоў.

— Нягледзячы на малады ўзрост, вы паступілі прагматычна, можна сказаць, мудра. У сэнсе, прынцыпы — гэта не так страшна. Можа, калі-небудзь і самі пачнеце «папсу» спяваць?

— Дык я і спяваю папсовыя песні, толькі крыху больш цяжкія. Тая музыка, якую я люблю і слухаю, — гэта не камерцыйная музыка, яна ідэйная, яна нават больш чым музыка. Гэта тое, што ў маім сэрцы і што я ніколі не буду прадаваць. Яно са мною назаўсёды. Але і тыя песні, што я пішу і спяваю — гэта маё роднае. Мая мара — запісаць дэбютны альбом менавіта так, як хачу. Я крыху баюся страціць індывідуальнасць, сваю асаблівасць, і паддацца агульнаму мэйнстрыму, баюся думаць пра тое, каб гэта хутчэй спадабалася, лепей прадалося. Я маю ўяўленне аб тым, што такое музыка для продажу, і калі б я хацела стаць вельмі багатай, я пісала б такія песні, для шырокай аўдыторыі. Але не хачу, і ведаю тыя межы, цераз якія не змагу пераступіць. Галоўнае, каб я змагла запісаць альбом так, як я гэта чую ў сябе ў галаве. Менавіта гэта для мяне цяпер самае галоўнае.

Надзея УЛАДЗІМІРАВА.

...ПАБЫВАЦЬ НА ДЫСКАТЭЦЫ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

— Між іншым, — расказвала Вікторыя Лапшына, — раней на дыскатэках у «Юнацтве» былі і такія канфліктныя сітуацыі, якія заканчваліся бойкамі. Аднойчы ў ход нават быў пушчаны нож. Былі і крадзяжы. Цяпер парадку тут стала больш. У парку дзяжурыць патрульна-паставая служба, і супрацоўнікі міліцыі таксама заглядваюць на дыскатэку. Ды і адміністрацыя палаца пэўныя высновы зрабіла.

Але, думаецца, да ідэалу тут яшчэ далекавата. Пачнём хоць бы з таго, што ў танцавальнай зале мы бачылі нямала складзеных куртак ды шапак, у якіх, дарэчы, хадзіў хто-ніхто і ў фае. Няўжо няўцям, што пакінутыя па-за гардэробам рэчы могуць выклікаць спакусу на крадзеж і тым самым задаць работу міліцыі?

Дарэчы, уваходныя білеты на дыскатэку ў «Юнацтва» самыя танныя ў горадзе — тры тысячы рублёў, і працуе яна да дзесяці гадзін вечара. Таму тут у залу набіваецца столькі маладых людзей самага рознага ўзросту (ад 14 да 27 гадоў), што ім там — нібы, прабачце, селядцам у бочцы. Складваецца ўражанне, што арганізатары дыскатэкі больш зацікаўленыя ў касавай выручцы, чым, скажам, у разнастайнасці музычных кампазіцый. Ды якія там кампазіцыі, калі ў зале грыміць такая какафонія, што хоць вушы затыкай. Цяжка сказаць, ці ўсёй моладзі гэта падабаецца, толькі танчаць усе. Хто як можа: адны з выкрутасамі, другія топчуцца на месцы, трэція немаведама што «выказваюць» сваім целам. Ды куды падзенешся — моладзі энергію трэба неяк расходаваць.

Што яшчэ кінулася ў вочы ў «Юнацтве»? Ледзь не павальнае курэнне — ад малога да дарослага. Яно забаронена ў памяшканні, а каля ўваходу цэлыя натоўпы курцоў і большасць з іх — дзяўчаты. Падумалася: каго яны будуць нараджаць, чаму ў нашым грамадстве здарылася тое, чаго, скажам, не было 20—30 гадоў таму? І чаму ўсе выхаваўчыя мерапрыемствы ў школе, дома, у сродках масавай інфармацыі, накіраваныя супраць курэння, разбіваюцца ўшчэнт аб прамую або ўскосную прапаганду яго ў кіно і на тэлебачанні? Пытанне не новае, але паранейшаму актуальнае.

На іншых дыскатэках і ў начных клубах Гомеля парадку куды больш. Усё, як гаворыцца, ад іх статусу. У «Плазу», напрыклад, можна зайсці толькі пры прад'яўленні пашпарта і прытым кожнаму наведвальніку на руку ставіцца спецыяльная пячатка, якая праглядваецца толькі пры ўльтрафіялетавым асвятленні. Гэта для кантролю, каб «на халяву» не зайшоў у перапынку той, хто не мае білета. Дарэчы, кошт яго даволі дарагі: у выхадныя ў вячэрні і начны час для мужчын 25 тысяч рублёў, для жанчын — 20. І нічога, народ запаўняе гэты клуб. На належным узроўні тут працуе служба бяспекі, установлены камеры назірання і г.д.

— На дыскатэках, у начных клубах, — расказвае намеснік начальніка ўпраўлення прафілактыкі УУС Гомельскага аблвыканкама Андрэй Краўчанка, — дзяжураць работнікі міліцыі, дружыннікі, прадстаўнікі абласнога і гарадскога аддзяленняў БРСМ. У сельскай мясцовасці арганізоўваюцца для гэтага і бацькоўскія патрулі. Пэўныя зрухі ў навядзенні парадку відавочныя, аднак над культурай паводзінаў нашай моладзі, як, дарэчы, і дарослых, трэба яшчэ шмат працаваць. Усяму грамадству.

З гэтым, мяркуем, спрачацца ніхто не будзе.

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

«СХЕМА» ХАБАРУ

Упраўленнем Дэпартамента фінансавых расследаванняў Камітэта дзяржаўнага кантролю Рэспублікі Беларусь па Віцебскай вобласці ўзбуджана крымінальная справа ў дачыненні да асістэнта кафедры Віцебскай дзяржаўнай акадэміі ветэрынарнай медыцыны.

Як паведамілі нам у рэгіянальным камітэце дзяржкантролю, выкладчык, знаходзячыся на сваім рабочым месцы, атрымаў ад студэнта гэтай ВНУ хабар за выстаўленне чатыром студэнтам высокіх адзнак за курсавыя работы без іх фактычнай абароны. Гэта паўплывала б на агульны сесійны бал і адпаведна на памер стыпендыі. Акрамя гэтага, абяцаў студэнтам допуск да здачы экзамену па прадмеце «аператыўная хірургія» без адпрацоўкі пропускаў і нездавальняючых ацэнак.

Установлена, што пры гэтым выкладчык выкарыстоўваў схему з праверанымі пасрэднікамі — студэнтамі акадэміі. Зараз праводзяцца следчыя мерапрыемствы па ўстанаўленні дадатковых фактаў атрымання хабараў, па выніках якіх узбуджаны яшчэ чатыры крымінальныя справы.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Зоркі спорту

Наталля Цылінская:

«НЕ ВЕДАЮ, ШТО БУДЗЕ НА НАСТУПНЫ ДЗЕНЬ ПАСЛЯ АЛІМПІЯДЫ»

Самыя тытулаваныя беларускія спартсмены заўсёды прыязджаюць на радзіму ў студзені — па падарункі за перамогі ў шматлікіх намінацыях кшталту «Лепшы спартсмен года». Вядомая беларуская спартсменка, васьмікаразовая чэмпіёнка свету па веласпорце Наталля Цылінская, якая па выніках мінулага года стала адной з самых паспяховых спартсменак сталіцы, функцыянерамі прадстаўніцтва Нацыянальнага алімпійскага камітэта па Мінску была ўзнагароджана адпаведным чынам. У якасці галоўнага падарунка каралеве велатрэку паднеслі веласіпед. А што Наталля? Наталля, пабываўшы на трох кантынентах, — у Сіднеі, Пекіне і Лос-Анджэлесе — дзе праходзілі этапы Кубка свету, два з якіх беларуска выйграла, прыехала ў сталіцу стомленая, хворая і да размоў не схільная. Зараз Наталля Цылінская з'яўляецца яскравым прыкладам таго, якімі загадкавымі і таямнічымі робяцца спартсмены ў чаканні такога феномену, як Алімпійскія гульні.

— Наташа, чаго не хапіла на першым этапе Кубка свету ў Сіднеі, каб атрымаць сваю першую перамогу ў сезоне?

— Часу не хапіла. У мяне яшчэ акліматызацыя поўным ходам ішла, паўфінал я сонная ехала. У 1/4 фіналу мяне дыскваліфікавалі. Я выйграла заезд, але мяне знялі і давялося даказваць, што я не вярблюд, і выйграваць яшчэ раз.

— Наколькі справядлівай была гэта дыскваліфікацыя?

— На такія парушэнні часта закрываюць вочы. Усё залежыць ад таго, дзе праводзяцца спаборніцтвы. Не магу сказаць, што да мяне ставяцца прадузята, я дастаткова акуратна езджу. Проста там многім дасталася. У Пекіне таксама ўсіх, каго можна, дыскваліфікавалі. Мірс знялі, кубінку знялі, яшчэ кагосьці знялі.

— Як табе пекінскі трэк?

— Добры трэк. Мне на ім ехалася нядрэнна.

— Вывучыць яго асаблівасці ўдалося? Вы, здаецца, павінны былі застацца там на зборы?

— Не, алімпійскі трэк адразу пасля этапа Кубка свету закрылі і нікога больш не пусцілі. Усё роўна за паўгода забудзеш. А зборы ў нас былі ў іншым месцы.

— Гіту сёлета надаеш менш увагі?

— Так, напэўна, штосьці расслабілася. Цяжка яго ехаць. Тым больш, што ў алімпійскай праграме засталася толькі адна дысцыпліна — спрынт.

— Як яго ўдалося выйграць на трэцім этапе Кубка свету ў Лос-Анджэлесе, дзе ты выступала з прастудай?

— Мне проста вельмі трэба было. Салаўёў (расійскі спецыяліст, трэнер Н. Цылінскай. — **Аўт.**), малайчына, бясспрэчна. Калі б ён мне даў слабінку, я, напэўна б, расслабілася. А так увесь час трымаў мяне ў тонусе: «Давай, давай, сёння папрацуй, заўтра ўжо не падзеш». У чацвер напярэдадні старту я захварэла, а ў пятніцу мяне плюшчыла, калбасіла і куралесіла па поўнай праграме. У такім стане і ехала. З намі не было доктара, дыягназ нават ніхто мне не мог паставіць. Дома высветлілася, што ў мяне бранхіт.

— Можна меркаваць, што самым складаным стаў фінальны заезд, дзе ты спаборнічала з амерыканкай Джэйн Рыд...

— Я звычайна вельмі дакладна памятаю ўсе свае заезды. А тут я выходзіла на старт і ведала, што мне трэба праехаць першай. А як усё гэта адбывалася, я не памятаю.

Амерыканка раней дэманстравала даволі пасрэдныя вынікі, а тут змяніла трэнера, і яе панесла. Тым больш выступала ўсё ж такі ў Амерыцы, перад сваімі балельшчыкамі. Так што як ні імкнуліся амерыканцы нас атруціць, нічога ў іх не атрымалася.

— ???

— Кармілі нас тухлымі бутэрбродамі. Сваю ж ежу ў Амерыку не правязеш. Хоць той фінальны заезд дастаткова просты. Ёсць больш вострыя саперніцы. Тыя ж Пендалтан, Мірс, Клара Санчас. Калі б у нас як у тэнісе было — трэнераў перад заездамі не падпускалі, мне б не трэба было і напружвацца. А так ім усё раскладуць, раскажуць, як рабіць.

— У саміх саперніц яшчэ няма тактычнага мыслення?

— Не тое каб яшчэ... Калі яго няма ў 25 гадоў, то і пасля наўрад ці з'явіцца. З Пендалтан мы ў адным заездзе ехалі на пекінскім этапе.

Яе трэнер немец Ванайдан, таксама ганяўся нядаўна, чэмпіён свету, даваў ёй парады перад заездам. У мяне, безумоўна, туга з англійскай, але пару слоў я ведаю. Краем вуха чую: «Гэта не Сідней, супакойся, збярыся». Я кажу: «Ну, не Сідней, а Пекін, і якая розніца?».

— Усе асноўныя саперніцы вам вядомыя ці, магчыма, хтосьці «шыфруецца»?

— Тут немагчыма зашыфравацца, таму што адбор на Алімпіяду вельмі жорсткі.

— Чым перад Алімпіядай дапамагае прадстаўніцтва Нацыянальнага алімпійскага камітэта?

— Калі прыязджаеш дадому, вельмі важна, што не толькі сочаць за тым, што ты робіш, але і дзякуюць. Прыемна, што падарылі веласіпед. Перад мінулай Алімпіядай таксама была нейкая пакупка. Але я рэдка бываю дома, магчыма, калі б была часцей, можна было б штосьці часцей атрымаць. І так усё выдатна. Веласіпед, зразумела, патрэбная рэч. Гэта здаецца, што адзін патрэбен. А на самай справе да пяці штук даводзіцца выкарыстоўваць. Трэкавы, шасейны, горны плюс на шашы патрэбны трэкавы, але на баявым там не паедзеш. Гэты веласіпед, ён будзе трэніровачным, вядома ж, да месца, бо стары ўжо зусім разваліўся. Баявы новы таксама ў мяне вось з'явіўся...

— Яго набыло Міністэрства спорту і турызму?

— Не хачу расказваць, хто набыў. Яго нядаўна з Амерыкі прывезлі.

— Да Алімпіяды яшчэ будуць спаборніцтвы?

— Чэмпіянат свету пройдзе ў канцы сакавіка, а як буду рыхтавацца — няхай Салаўёў думае, гэта не мая справа.

— Падрыхтоўка будзе ў Маскве?

— Не, у іншым месцы, якім — не скажу. У Маскве пакуль што няма чаго рабіць. Мы на трэк прыязджаем за 20 дзён да спаборніцтваў.

— Перад цяперашняй Алімпіядай не будзе праблем з маскоўскім трэкам, як гэта здарылася перад папярэднімі спаборніцтвамі чатырохгоддзя?

— А я пакуль пра гэта не думаю. Думка матэрыяльная, не будзем прыцягваць негатыў.

— Як пажывае твая дачка?

— Дрэнна без мамы, што і казаць. Кожны дзень не назвонішся, я ж увесь час у глыбокім роўмінгу сяджу. Сазвоньваемся, спісваемся.

— Як вучыцца?

— Не адлічылі пакуль. Шасцёркі, сямёркі, васьмёркі. У яе іншае захапленне — тэніс, і яна ўся там.

— Хоць адзін яе матч бачыла?

— І не адзін. Падказаць нічога не магу — у тэнісе я не разумею нічога. Правілы я ведаю, але ў яе ёсць трэнер, які і раіць, як сыграць. У мяне толькі эмоцыі. Хварэць заўсёды складаней, чым ехаць ці гуляць.

— Вы строгая мама?

— Зусім не. Я тэлефаную сяброўцы, якая выхоўвае маю Машу: «Заўтра прыязджаю, дзеці ў школу не ідуць!». Настаўніца ў пачатковай школе, калі Маша не прыходзіла, тэлефанавала Іне: «Ну што, мама прыехала?».

— Пасля Алімпіяды ў Пекіне застанецеся ў спорце?

— Я пакуль не думаю нават пра тое, што будзе на наступны дзень пасля Алімпіяды.

Алена АЎЧЫННІКАВА.
Фота Вольгі ЛАСКІ.

Бліжэй да цела

ЯКІ РАМАНТЫЧНЫ СЭКС... ТАНТРЫЧНЫ?

Што толькі не робяць мужчыны, каб у сэксе быць супер. Ды і жанчыны, напэўна, таксама. Нават спецыяльнай ёгай займаюцца. Некаторыя выпрабоўваюць на сабе дзеянне такога таямнічага для большасці з нас... тантрычнага сэксу.

— Тантрычная ёга — гэта адзін з асноўных відаў ёгі. Дзякуй старажытным індусам, якія распрацавалі шэраг методык па аздараўленні і самаўдасканаленні. Само слова «ёга» можна перакласці з санскрыцкай мовы як «аб'ядноўваць». Гэта значыць — стварыць саюз душы і ўсёпранікальнай энергіі, — расказвае віцебскі ёг Станіслаў Івашкін.

— Ёсць карма ёга, дзе трэба проста выконваць карму (абавязкі) без чакання канкрэтных вынікаў дзейнасці, а галоўная задача — дасягнуць міласці Бога.

Вядомая і мантра ёга — гэта, калі чалавек доўга ўслых чытае спецыяльныя мантры і такім чынам «вызваляецца ад індывідуальнасці», поўнасцю становіцца вольным.

Тантрычная ёга ў Індыі вядомая прыкладна з X стагоддзя. У ёй саюз душы і ўсёпранікальнай энергіі дасягаецца з дапамогай сэксуальнай энергіі. Апошняя актывізуецца, дзякуючы спецыяльным фізічным позам (асанам) раскрывае свой патэнцыял і «падымаецца ў космас». Сэкс для прыхільніка гэтага накірунку — крыніца жыццёвай энергіі і праяўленне дзейнасці саміх вышэйшых сілаў, «любоў з космасам». Абсалютнай істотай у такіх ёгаў лічыцца Ён і Яна, «злітыя ў адно цэлае» падчас заняткаў сэксам. І такім чынам раскрываюцца патэнцыялы ўнутранай жыццёвай сілы.

Але ж большасць сур'ёзных ёгаў адмовіліся ў свой час ад практычных заняткаў такой групавой ёгай. Тлумачыць, чаму, можна доўга, і зразумеюць гэта нямногія. Але, калі проста — гэта не той шлях, каб атрымаць магчымасць «прымушаць» абуджацца першапачатковую энергію (кундаліні), якая «захоўваецца» ў крыжу пазваночніка чалавека. Калі кундаліні падымаецца, гэта дае самарэалізацыю, сапраўдны саюз з вышэйшымі сіламі.

Вельмі шкада людзей, якія раней наогул не займаліся ёгай, а пачынаюць адразу практыкаваць тантрычны сэкс. Часта такія эксперыменты даюць зваротны эфект. У прыватнасці, у недзяржаўную медыцынскую ўстанову Віцебска звярнуўся па дапамогу да ўролага грамадзянін з незвычайнай скаргай: вывучаў тантрычную ёгу, ды з'явіліся праблемы з патэнцыяй. 32-гадовы пацыент начытаўся спецыяльнай літаратуры, спрабаваў займацца «тантрай» з жанчынамі і нават ездзіў у Маскву на семінар па тэме. Мо вельмі паспяшыў у дасягненні станоўчых вынікаў, наогул не зразумеў галоўных момантаў такой ёгі.

Што датычыцца такіх семінараў, па цэнтральных расійскіх каналах у розных папулярных праграмах пра іх перыядычна расказвала нейкая дама зусім не бальзакаўскага ўзросту, якая, дарэчы, некалькі разоў была замужам. І ганарылася тым, што ўсе яе былыя партнёры «страчвалі розум» ад яе майстэрства ў каханні. Маўляў, я доўга вывучаю спецыяльную ёгу, і цяпер усе ахвотнікі збіраюцца і даследуюць методыку пад маім кіраўніцтвам. Нават рэпартажы з «месца заняткаў» паказвалі. Грошы плацяць за навучанне немалыя.

— Сэкс і цяпер для многіх — нейкая невядомая тэма. Што ўжо гаварыць пра тантрычны. А, як вядома, на попыт заўсёды ёсць прапановы. Наўрад ці вядучыя курсаў па нетрадыцыйных методыках сэксу самі з'яўляюцца вялікімі экспертамі ў гэтым. Няўжо самі ездзілі вучыцца ў далёкую Індыю? Вядома, што сапраўдныя настаўнікі — ёгі з вялікай літары — вельмі рэдка арганізуюць масавыя заняткі. Тым болей такія спецыфічныя, — расказвае супрацоўнік недзяржаўнага медыцынскага цэнтра ў Віцебску. — Шкада, але і зараз прафесійных сэксапатолагаў у рэспубліцы можна па пальцах пералічыць. Ды і хай у іх штогод бывае, на іх погляд, нямала кліентаў, рэальна тых, хто мае патрэбу ў спецыфічнай дапамозе, у сотні, калі не ў тысячы разоў больш. І, безумоўна, калі няма магчымасці выбару спецыялістаў (мо адзіны на вобласць сэксапатолаг не спадабаўся пацыенту як прафесіянал), людзі не запісваюцца на прыём. І не раяць знаёмым. Займаюцца самалячэннем, вывучаюць нейкія методыкі самастойна альбо дыстанцыйна. На жаль, калісьці проста нас прывучылі, што сэкс — гэта справа «прыватная». Толькі ў апошнія гады пра «сэксуальнае здароўе» сталі шмат пісаць, абмяркоўваць гэтую тэму падчас «прамых ліній» і г.д.

Безумоўна, сама па сабе тэма цікавая. І мае суразмоўцы кажуць праўду, што трэба быць падрыхтаваным да прымянення «ноў-хаў» у сэксуальным развіцці. Спачатку, вядома ж, трэба паправіць сваё здароўе ў цэлым. Прытрымлівацца здаровага жыцця, займацца аздараўленнем арганізма, правільна харчавацца, дастаткова спаць, пазбягаць стрэсаў, не курыць, а калі ўжо піць, дык ведаць меру.

І любы сэксапатолаг пацвердзіць, што ўсяго гэтага дастаткова для нармальнага сэксуальнага жыцця. Але ж гэта можа стаць тэмай новай публікацыі. Не варта забываць, што самым сэксуальным органам мужчыны жанчыны лічаць... розум. А разумны зможа і без спецыяльных тэхнік задаволіць. Альбо не так?

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Выпрабавана на сабе

ДАДАТКОВЫ ЗАРОБАК? А ЧАМУ Б І НЕ!

Апошнім часам у падземных пераходах часта можна ўбачыць маладых людзей, якія раздаюць нейкія паперкі. Тэкст іх прыблізна аднолькавы: «Жадаеце зарабляць вялікія грошы? Тады вам да нас. Дадатковы заробак для тых, у каго ёсць дзве-тры вольныя гадзіны ў дзень». Мы вырашылі праверыць, што гэта за праца.

На паперцы быў указаны нумар тэлефона і паштовы адрас. На мой званок ніхто не адказваў. Не доўга думаючы, пішу ліст і адпраўляю на патрэбны адрас. Праз некаторы час атрымліваю адказ: «Дзякуем за водгук на нашу аб'яву. Вы звярнуліся ў інфармацыйна-аналітычнае агенцтва ў адказ на аб'яву ў сродках масавай інфармацыі. У адпаведнасці з вашым запытам паведамляем аб прыняцці вашай папярэдняй просьбы на падрабязнае азнаямленне. У адказ мы накіруем вам даведкава-тлумачальны метадычны матэрыял. На сёння гэты матэрыял каштуе 9500, уключаючы друкарскія і паштовыя выдаткі. Пасля атрымання пакета вы зможаце неадкладна прыступіць да працы...»

Спіс прапанаваных прац

Далей быў надрукаваны пералік метадычных матэрыялаў па арганізацыі надомных прац:

1. Выраб паўфабрыката для фармацэўтычнай прамысловасці. Праца звязана са зборам, апрацоўкай бясшкоднай сыравіны, якая ёсць практычна ўсюды, але не ў вялікай колькасці. Заработная плата здзельная, у месяц можа дасягаць тысячу долараў і вышэй.

2. Рэалізацыя замежнікам калекцыйных прадметаў. Праца цікавая, звязаная з перапіскай з замежнымі краінамі. Занятасць — 1-2 гадзіны ў дзень. Заработная плата здзельная, 300 долараў і вышэй.

3. Замежная праца. Магчымасць працаўладкавацца ў розных краінах свету на розныя спецыяльнасці.

Перавагі дадзеных прац

1. Неабходная для працы дакументацыя будзе высланая заказной поштай на працягу тыдня з моманту атрымання ад вас заяўкі.

2. Сістэматычнае атрыманне прыбытку (без затрымкі зарплат).

3. Рэальная магчымасць займацца працай, не выходзячы з кватэры.

4. Падтрымка ў працэсе працы.

5. Адначасова з гарантыямі мы падаём шырокі спектр паслуг.

6. Дзіўна простая тэхналогія вядзення спраў.

7. Невялікі кошт камплекту дакументаў без абмежаванняў у выбары працы.

Для таго, каб людзі канчаткова паверылі ў сур'ёзнасць усяго прапанаванага, аўтары ліста напісалі: «Кампанія першапачаткова стваралася з мэтай аказання паслуг у галіне працаўладкавання, і заўсёды працуе ў гэтым кірунку. Мы заводзім новыя кантакты з многімі арганізацыямі і кампаніямі, знаходзім лепшыя і самыя перспектыўныя прапановы. Каб працаваць з намі, вам не абавязкова быць дасведчаным спецыялістам і мець асаблівыя здольнасці. Законнасць кампаніі выкананая і рэгламентаваная дакументамі адпаведных інстанцый».

Пагадзіцеся, праца і аплата прывабныя. Чаму б не рызыкнуць і не заплаціць за гэтую інфармацыю? Так і раблю. Проста вельмі хочацца стаць забяспечаным чалавекам.

Схадзіў на пошту, зрабіў аплату. Праз тыдзень прыйшоў адказ.

Методыка працы па рэалізацыі калекцыйнага матэрыялу за мяжу

«Гэтая праца, акрамя цікавых зносінаў з замежнымі партнёрамі, у працэсе якіх вы можаце павысіць свае веды замежнай мовы, дазволіць значна палепшыць ваша матэрыяльнае становішча і прынясе вам унікальную магчымасць спалучаць сваё захапленне з бізнэсам».

Для таго, каб прыступіць да працы, трэба ўсталяваць кантакты з калекцыянерамі іншых краін, апублікаваўшы за мяжой аб'явы аб продажы калекцыйнага матэрыялу. Прыблізны тэкст аб'явы: «Калекцыянер з Беларусі шукае партнёраў...» або «Прапаную любы калекцыйны матэрыял з Беларусі...». Загадзя, пакуль аб'ява яшчэ не апублікавана, трэба скласці тыпавы ліст, які трэба высылаць кліентам. Як правіла, на такія аб'явы прыходзіць ад 10 і больш водгукаў. У лісце трэба паведаміць, што будзеце рэгулярна высылаць матэрыял, які іх цікавіць, за валюту. Варта ўказаць прыблізны кошт матэрыялу і ўмовы аплаты. Як было паказана, перапіску лепш за ўсё весці на англійскай мове. У лісце трэба паказаць кошт калекцыйнага матэрыялу. Калі ўзнікаюць цяжкасці ацаніць тавар, запытайцеся аб гэтым у замежнага партнёра.

Далей быў надрукаваны вялікі спіс таго, што карыстаецца найбольшым попытам. Як аказалася, найбольшым попытам за мяжой карыстаюцца старыя і сучасныя манеты, банкноты, паштоўкі, маркі, значкі, этыкеткі напояў і многае іншае. Як удакладнялі «працадаўцы», вельмі добра ідуць і латарэйныя квіткі. У Амерыцы, Канадзе, Германіі ахвотна набываюць прадметы воінскага абмундзіравання, знакі адрознення. Вялізным попытам ва ўсім свеце карыстаюцца... скарыстаныя тэлефонныя карткі. Нават абгорткі ад айчыннага шакаладу і цукерак можна выгадна прадаць.

«Звярніце адмысловую ўвагу на якасць матэрыялу, які будзеце высылаць. Паштоўкі павінны быць новымі. Хоць, напрыклад, японцы аддаюць перавагу манетам старым, без бляску. Падыходзьце да гэтага пытання індывідуальна, у адпаведнасці з пажаданнямі кожнага пэўнага кліента».

Аказалася, што насамрэч знайсці калекцыйны матэрыял не так ужо і складана. Яго можна купіць у спецыялізаваных калекцыйных крамах або ў айчынных калекцыянераў. Была нават парада з нагоды таго, каб збіраць тэатральныя і авіябілеты, здымаць з бутэлек этыкеткі. Усё гэта, аказваецца, пры вялікім жаданні можна прадаць. Калі ў вас нічога няма з вышэйпералічанага, то можна даць аб'яву аб куплі такога матэрыялу.

Далей было напісана пра самае цікавае — грошы. «Выгадней за ўсё прадаваць калекцыйны матэрыял італьянцам. Яны шчодрыя і, як правіла, сумленныя ў падобнага роду справах. Сярод іх асабліва шмат калекцыянераў абсалютна непатрэбных рэчаў.

Міжнародныя тарыфы на паштовыя паслугі растуць, таму не саромейцеся прасіць сваіх кліентаў вярнуць некампенсаваныя маркі з адпраўленых лістоў. Вас зразумеюць правільна, бо там умеюць лічыць грошы. Для атрымання грошай з-за мяжы (за калекцыйны матэрыял) можна адкрыць валютны рахунак у банку. Для гэтага спачатку трэба зарэгістраваць сваю прадпрымальніцкую дзейнасць у мясцовай адміністрацыі. Так, гэта прастыжна, але немэтазгодна. Просіце штосьці на бартэр: вопратку, абутак... Звычайна ж, перапраўляюць валюту кантрабандай — паміж дзвюма паштоўкамі або шчыльнымі лістамі паперы. Хоць гэта і з'яўляецца парушэннем мытных і паштовых правілаў, большасць паступае менавіта так. Гэта не караецца законам. У горшым выпадку купюру на мытні канфіскуюць. Абавязкова скажыце, на якія мэты вам патрэбна валюта: купля кватэры, лячэнне дзіцяці... Замежныя партнёры, ведаючы, што вы не купаецеся ў грашах, ахвотна дапамогуць ажыццявіць вашы планы і мары. Калі вы хочаце наладзіць сталае супрацоўніцтва з калекцыянерамі, кантакт з імі не павінен насіць толькі дзелавы характар. Памятайце, што вы працуеце з жывымі людзьмі. Будзьце з усімі партнёрамі ветлівымі, карэктнымі, уважлівымі. Не забывайце своечасова павіншаваць іх са святамі. Тады ў вас будуць не толькі кампаньёны, але і сябры».

Фаварытамі 50-ай прэміі «Грэмі», паводле папярэдніх ацэнак, з'яўляюцца брытанская спявачка Эмі Уайнхаус і амерыканскі рэпер Канье Вест. Хапае сярод прэтэндэнтаў і прызнаных «зорак»: Пол Макартні, Крысціна Агілера, «Green Day» , «Nickelbak» «U2» і г.д.

ДАРЭЧЫ

Прэмія «Грэмі» была заснаваная Асацыяцыяй гуказапісваючых кампаній ЗША ў 1958 годзе, а ідэя нарадзілася ў прафесійных музыкантаў на год раней, калі адзначаўся юбілей вынаходніцтва Томасам Эдзісанам грамафона. Менавіта таму была абрана назва «Грэмі» і форма прызавой статуэткі — пазалочаны грамафон. Так што ўсе іншыя «грамафонныя» хіт-парады, не важна, залатыя ці сярэбраныя — усяго толькі калька...

Байцам «нябачнага фронту» прысвячаецца

З 10 лютага Першы канал пачне прэм'ерны паказ дакументальна-хранікальнага цыкла «Нябачны фронт». Праект гэты, у якім выкарыстаныя сакрэтныя матэрыялы з архіваў СССР і эксклюзіўныя відэакадры, створаны пры садзейнічанні спецслужбаў Беларусі і Расіі.

Цыкл фільмаў ахоплівае прамежак часу ад XIX стагоддзя да сучаснасці, а героямі праекта сталі людзі, чыя прафесійная дзейнасць па зразумелых прычынах застаецца ў цені — ад агентаў царскай разведкі да антытэрарыстычных фарміраванняў новага тысячагоддзя. «Нябачны фронт» падзелены на тэматычныя блокі. «Афганскі» блок раскажа аб рабоце падраздзяленняў «Зеніт» і «Гром»; «рэвалюцыйны» прысвечаны дзейнасці Азефа, Гапона, Савянкова і іншых тэрарыстаў і правакатараў; «партызанскі» ўзгадае пра партызанаў дзвюх Айчынных войнаў; «разведвальны» распавядзе пра легендарную аперацыю савецкай разведкі «Трэст», урадавую «вяртушку», супрацоўніцтва экстрасэнсаў са службамі ЦРУ і г.д. Усе фільмы будуць паказвацца ў дзённым эфіры Першага канала па нядзелях.

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

РУП "Мінск-Крышталь" трымае курс на лідарства

Сённяшнія пазіцыі РУП "Мінск-Крышталь" вызначаюцца павышанай трываласцю. Прычым, не толькі на айчынным рынку, але і далёка за яго межамі. Прафесіяналы сваёй справы пацвярджаюць званне лідара больш за сотню гадоў і маюць больш чым векавы вопыт вытворчасці якасных віна- і лікёра-гарэлачных вырабаў.

Зараз прадукцыя

Прамая лінія

РАЗ КАШТОЎНАСЦЬ, ДВА КАШТОЎНАСЦЬ...

Госць «прамой лініі» — Ігар ЧАРНЯЎСКІ, намеснік начальніка Управлення па ахове гісторыка-культурнай спадчыны і рэстаўрацыі Міністэрства культуры. Весці праграму ў студыі радыё-журналісту Максіму Углянцу дапамагала карэспандэнт «Звязды».

(Заканчэнне. Пачатак у нумары за 7 лютага.)

— А як справы са спецыялістамі-рэстаўратарамі ў Беларусі?

— Трэба прызнаць, што ёсць пэўны недахоп спецыялістаў. Праблема ў тым, што па пэўных накірунках рэстаўрацыйнай дзейнасці недастатковая колькасць заказаў. Ну, напрыклад, можам гаварыць пра мастакоў-рэстаўратараў: па пальцах можна пералічыць аб'екты, якія пастаянна фінансуюцца і на якіх могуць працаваць такія спецыялісты. Вось нядаўна працавалі ў Мінскім архікафедральным касцёле (былы Езуіцкі касцёл), дзе праводзілася рэстаўрацыя жывапісу. Праца яшчэ не скончана — у нейкіх дэталях (бакавых нефах, капліцах) працы гэтыя будуць працягвацца. Работы вядуцца ў Гродзенскім езуіцкім касцёле — там нават бяруць удзел нашы калегі з Польшчы, бо сам характар прац дастаткова складаны і патрабуе пэўнага вопыту спецыялістаў. Ці возьмем Спаса-Праабражэнскую царкву ў Полацку, дзе вядзецца рэстаўрацыя жывапісу XII стагоддзя: хоць там і працуюць беларускія спецыялісты, аднак асноўную ролю ўсё ж такі выконваюць рэстаўратары з Расіі пад кіраўніцтвам вельмі вядомага майстра Уладзіміра Сараб'янава. Можна было б гаварыць і пра многія іншыя аб'екты, дзе ёсць жывапіс, і дзе патрэбны ўдзел прафесіяналаў рэстаўратараў, аднак пакуль выдзяляецца недастаткова сродкаў для правядзення такіх прац.

— Як быць з аховай тых помнікаў, якія не ўключаны ў Дзяржаўны спіс? Вось, напрыклад, у вёсцы Кашталянаўшчына, што за восем кіламетраў ад Глыбокага, ёсць стары млын, размешчаны ў былым маёнтку Чарняўскіх. Дык гэты млын цяпер разбіраюць на цэглу.

— На жаль, гаварыць пра юрыдычную ахову аб'ектаў, не ўключаных у спіс, канкрэтна не даводзіцца. Справа ў тым, што тут дзейнічаюць заканадаўчыя акты, якія рэгулююць адносіны на мясцовым узроўні, пытанні права ўласнасці. І ўласнік вольны паступіць са сваім аб'ектам так або іначай. Будынак у Кашталянаўшчыне — далёка не адзіны такі аб'ект. Мы хацелі б, каб яны былі ўключаны ў спіс, вядзём адпаведную працу — падбіраем неабходныя абгрунтаванні. Узяць тыя ж Гальшаны — гэта ж узор традыцыйнага беларускага мястэчка. А Іўе? З яго адметнай планіроўкай і характэрнай забудовай, якая паказвае традыцыі па меншай меры перадваеннага перыяду канца XIX стагоддзя.

Аб'ектаў даволі шмат, і, на жаль, уключыць іх усе адразу ў Дзяржаўны спіс проста немагчыма. Таму яны застаюцца з пункта гледжання аховы спадчыны безабаронныя, але з пункту гледжання, напрыклад, заканадаўства аб архітэктурнай, будаўнічай і гарадабудаўнічай дзейнасці яны могуць быць абаронены, таму што кожны населены пункт развіваецца па сваіх правілах, і тое, што закладзена ў генеральных планах гарадоў і іншых населеных пунктаў, павінна выконвацца.

Таму калі гаварыць пра заканадаўства аб ахове спадчыны — гэта не толькі адзіны Закон «Аб ахове спадчыны», гэта комплекс законаў, і ў гэтых з'явах, відавочна, трэба карыстацца комплексам заканадаўчых актаў, якія рэгулююць працэсы развіцця, добраўпарадкавання, уладкавання пэўных тэрыторый.

— Ці прынята канчатковае рашэнне пра далейшы лёс помніка архітэктуры XVII стагоддзя — Кляштар Бернардзінцаў у Мінску?

— Канчатковага рашэння як такога пакуль не прынята, хоць накірунак вымалёўваецца і тэма гэта сярод спецыялістаў актыўна абмяркоўваецца. Праектаваннем займаюцца вопытныя спецыялісты — супрацоўнікі «Мінскпраекта». Самім заказчыкам — УП «Мінская спадчына» — першапачаткова планавалася размясціць там гатэльны комплекс. Зрэшты, гэта не пярэчыла заканадаўству, вядома ж, пры ўмове захавання ўсіх гістарычных адметнасцяў архітэктурнага комплексу. Аднак у працэсе правядзення даследаванняў — і археалагічных, і гісторыка-архіўных — было вырашана такое функцыянальнае прызначэнне змяніць. А вось якім чынам яно будзе зменена, якраз і абмяркоўваецца, у прыватнасці, спецыялістамі Упраўлення па ахове гісторыка-культурнай спадчыны і рэстаўрацыі Міністэрства культуры, Камітэта архітэктуры Мінгарвыканкама. І што цікава, некалі выказаная мною і раскрытыкаваная апанентамі думка аб тым, што варта было б прыстасаваць кляштарны комплекс пад музей, цяпер якраз набывае актуальнасць. Зразумела, спецыфіка музея павінна адпавядаць тым гістарычным мурам. Так што там цяпер усё на стадыі выканання навукова-даследчых прац — вельмі карпатлівай, дастаткова складанай па сваім характары стадыі. І ў залежнасці ад таго, наколькі скрупулёзна будуць праведзены працы на гэтай стадыі, настолькі якасная праектная дакументацыя будзе падрыхтавана.

— Па якіх аб'ектах гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі рыхтуюцца дакументы для ўключэння ў Спіс сусветнай спадчыны ЮНЕСКА?

— Назаву самыя адметныя. Па-першае, Аўгустоўскі канал — аб'ект унікальны для Беларусі сам па сабе і з улікам беспрэцэдэнтнага характару прац, якія праводзіліся там на працягу некалькіх гадоў. Аўгустоўскі канал прапанаваны для ўключэння ў спіс як трансгранічны аб'ект — на мяжы дзвюх краін (Беларусі і Польшчы), таму і праца вялася сумесна. Летась дасье было завершана, падпісана афіцыйнымі асобамі Беларусі і Польшчы і накіравана для разгляду ў Цэнтр сусветнай спадчыны ЮНЕСКА. Мяркую, што ў наступныя некалькі месяцаў мы можам чакаць экспертаў ЮНЕСКА, якія прааналізуюць усе тыя абгрунтаванні, якія мы прадставілі па гэтым аб'екце. Літаральна днямі завершана праца па полацкіх аб'ектах і прадстаўлена ў ЮНЕСКА намінацыя, якая атрымала назву «Матэрыяльнае ўвасабленне духоўнай спадчыны Святой Ефрасінні Полацкай».

Вядзецца работа і па Брэсцкай крэпасці. Яна пакуль яшчэ не на той стадыі, каб можна было гаварыць, у якім выглядзе яна будзе завершана, тым больш, што гэта таксама трансгранічны аб'ект (на мяжы Беларусі і Польшчы). На падыходзе ўжо праца па абарончых культавых збудаваннях Беларусі. Найбольш вядомыя з іх — царква ў Сынкавічах, у Мураванцы. Існуе яшчэ шэраг аб'ектаў, якія могуць дапоўніць гэты пералік: касцёл у Чарнаўчыцах, у вёсцы Камаі — па іх пакуль праца на стадыі асэнсавання. Вельмі цікавае культавае драўлянае дойлідства беларускага Палесся — аб'ект наскладанейшы для захавання: дрэва ж — матэрыял недаўгавечны. Тым не менш у Беларусі ёсць выдатныя ўзоры, і па гэтай тэме мы мяркуем папрацаваць ушчыльную. Увогуле мы прапанавалі 10 намінацый для ўключэння ў Спіс сусветнай спадчыны ЮНЕСКА. Некаторыя з іх ужо рэалізавалі, частка прапанавана да рэалізацыі, а па астатніх (дзесьці пяць аб'ектаў) нам належыць яшчэ асэнсаваць сам змест будучых дасье, вызначыцца з асаблівасцямі, паводле якіх мы будзем прапаноўваць пэўны аб'ект — з улікам асяроддзя, аўтэнтычнасці, матэрыялаў выканання, аўтарскай задумы і яе рэалізацыі. Так што праца вялікая, няспынная.

Падрыхтавала Ала МАЧАЛАВА.

ДАРОГА З-ПАД ВЯНЦА

(Працяг. Пачатак у нумары за 7 лютага.)

Каля роднай брамы

Нарэшце, усе перапетыі вясельнага поезда вычарпаны. Гучныя гукі гармоніка, бубна, скрыпкі, дуды апавяшчалі аб тым, што доўгачаканыя госці прыпыніліся каля варот бацькоўскай сядзібы. Далей мы будзем разглядаць той варыянт разгортвання вясельных падзей, у якім жаніх і нявеста разам прыязджаюць да хаты бацькоў нявесты.

Амаль паўсюдна вясельны поезд павінен быў заехаць прама ў двор. Аднак перш чым гэта адбудзецца, нехта са старэйшых мужчын з роду нявесты прама ў варотах запальваў куль саломы. Нашы інфарматары з розных куточкаў Беларусі неаднаразова звярталі ўвагу на гэта нечаканае, на першы погляд, дзеянне. Аказваецца, гэты рытуал меў ахоўны і магічна-прадуцыравальны характар. Адночы народная лекарка з в. Азярышча Мінскага раёна Ф.А. Бялова паведаміла нам наступную «гісторыю». Па дапамогу да яе звярнулася жанчына, маўляў, схадзіла з дачкой на вяселле, пасля якога дзяўчынка пачала хварэць. Баба Феня ўзяла кавалачак хлеба, зрабіла з яго кругляш і, прыгаворваючы словы малітвы і чытаючы спецыяльныя замовы, абносіла тым хлебным шарыкам вакол дзіцяці. Праз нейкі час яна разламала хлеб напапалам і пачала «чытаць» малюнак, які атрымаўся на ўнутранай паверхні. Там дакладна відаць была брама і нейкая «драбяза». Бабуля тут жа расшыфравала ўбачаную выяву. Нехта з гасцей прыйшоў на вяселле з благім намерам. Той чалавек насыпаў у варотах нагавораную манку, каб нашкодзіць нявесце. Але паперад яе ў гэтых варотах прайшла ні ў чым не павінная дзяўчынка, якая, дарэчы, мела тое ж самае імя, што і маладая. Вось дзяўчо і забрала на сябе бяду, «прыгатаваную» зусім для іншага чалавека. А прычынай пераадрасоўкі было якраз аднолькавае імя. У якасці прадмета-пераносчыка шкоднай інфармацыі можа служыць «мёртвая» вада (тая, у якой мылі нябожчыка), магільная зямля або іншыя нагаворныя прадметы. Было зламыснае дзеянне ці не было — ніхто не ведае, але ў народзе казалі: «Сцеражонага і бог сцеражэ». Менавіта вось з гэтай нагоды непасрэдна ў варотах і выконвалі рытуал-абярэг — палілі сноп старой саломы.

Нарэшце, павозка, у якой знаходзіліся маладыя, заехала прама ў двор, спынілася. Аднак маладыя не спяшалі пакідаць яе. Справа ў тым, што з гэтага моманту пачнецца актыўнае мадэляванне будучага багатага жыцця маладой пары, таму ў цэлым шэрагу ключавых момантаў трэба было выканаць сімвалічныя па сваёй сутнасці абрадавыя дзеянні, што ўтрымлівалі ў сваім змесце ідэю плоднасці і багацця.

Калі адзін гаспадар прадаваў карову другому, то абодва паціскалі адзін аднаму рукі або перадавалі грошы ці вяроўку толькі праз крысо паліто, кажуха, паддзёўкі, але ні ў якім разе не голай рукой. Гэтаксама будуць закрываць рукі і ўсе тыя, хто будзе браць удзел у абрадзе адорвання маладых падчас дзяльбы каравая.

Менавіта таму першы крок сумеснага жыцця маладыя не мелі права ступіць на голую зямлю. Сваты хуценька рассцілалі перад возам посцілку або даматканую дарожку ці кажух і толькі тады першым на зямлю ступаў жаніх. Ён падаваў нявесце руку, тая павінна была абапірацца толькі на яе і ні ў якім разе не станавіцца на кола. Гэты знак лічыўся надзвычай кепскай прыметай — маладыя маглі застацца бяздзетнымі. Жаніх і нявеста злезлі з воза і прыпыніліся: яны чакалі, калі на парозе хаты з'явяцца бацькі нявесты. Яшчэ раз нагадаем, што **ў асяроддзі беларусаў існавала забарона пераходзіць дарогу пахавальнай працэсіі або вясельнаму картэжу**. Аналагічнае правіла тычылася і моманту сустрэчы маладых перад парогам бацькоўскай хаты. Ні адзін з прысутных не меў права перайсці тую сцежку, па якой пойдзе павенчаная пара. У некаторых рэгіёнах для таго, каб шлях да роднага парога быў чыстым і лёгкім, адна з прысутных жанчын венкам падмятала дарогу перад маладымі. Як толькі маладыя зрушылі з месца, гурт прысутных жанчын-спявачак тут жа падхоплівaў песню, першыя словы якой так і заклікалі: «Ой, варогі, варогі, не пераходзьце дарогі».

Рытуальныя дзеянні на парозе хаты

. На веснічках, перад самым парогам хаты, маладых сустракалі бацькі нявесты. Яшчэ раз нагадваем, што ў тым выпадку, калі на момант вянчання дачкі яе бацькі былі «не ў пары», то абрад сустрэчы маладых выконвалі пасажоныя бацькі: «Калі маці маладой удава альбо за ўдаўцом, яна не павінна сустракаць маладых; гэтую ролю выконвае «хросная» альбо яшчэ якая-небудзь жанчына, не ўдава. Яе называлі намеснічай». Гэтыя ж патрабаванні ў роўнай ступені тычыліся і бацькоў жаніха.

Маці была апранута ў вывернуты кажух (незалежна ад пары года, у якую ладзілі вяселле), поўсцю наверх. Яна трымала ў руках ручнік, на якім ляжалі хлеб-соль, а бацька трымаў сямейны абраз.

Біццё посуду як абавязковае абрадавае дзеянне

Часцей за ўсё першыя рытуальныя дзеянні пры сустрэчы маладых пачыналіся з таго, што бацька наліваў дзве чаркі гарэлкі (безумоўна, некалі гэта была медавуха) і прапаноўваў маладым выпіць іх. **Для маладых гэта быў свайго роду экзамен**, які неабходна было вытрымаць на вачах усіх прысутных і тым самым пацвердзіць веданне традыцый роду, ступень падрыхтаванасці да самастойнага жыцця, а самае галоўнае — ці гатовы жаніх і нявеста да працягу свайго роду. Напярэдзе ў маладых была **першая ў жыцці шлюбная ноч**, таму ўжываць якія-небудзь моцныя **напоі ім катэгарычна забаранялася**.

Аксана КАТОВІЧ.
Янка КРУК.

(Працяг будзе.)

НАДВОР'Е на заўтра



...у суседзяў

ВАРШАВА +6..+8°С	КІЕЎ 0..+2°С	РЫГА +2..+4°С
ВІЛЬНЮС +2..+4°С	МАСКВА +1..+3°С	С.-ПЕЦЯРБУРГ +1..+3°С

Месяц

Маладзік 6.45.
Месяц у сузор'і Вадалея.

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	7.45	17.03	9.18
Віцебск —	7.39	16.49	9.10
Магілёў —	7.35	16.53	9.18
Гомель —	7.27	16.55	9.28
Гродна —	7.59	17.19	9.20
Брэст —	7.55	17.25	9.30

Імяніны

Пр. *Марыі, Антона, Аркадзя, Івана, Іосіфа, Пятра, Сямёна, Фёдара;*
К. *Герасіма, Пятра, Яна.*

Дзве даты

8 лютага

1753 год — 255 гадоў таму пры Віленскім універсітэце заснавана Віленская астранамічная абсерваторыя — адна з найстарэйшых у Еўропе. Яе заснавальнікам і першым дырэктарам быў М. Пачобут-Адляніцкі.

1928 год — 80 гадоў з дня нараджэння выдатнага савецкага акцёра, народнага артыста СССР, Героя Сацыялістычнай Працы Вячаслава Васільевіча Ціханава. Здымаўся ў фільмах «Вайна і мір», «Дажывём да панядзелка», «Белы Бім Чонае вуха», «Семнаццаць імгненняў вясны» і многіх іншых. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР (1970 г.).

Цытата дня

«Паспяховы мужчына — той, хто зарабляе грошай больш, чым можа патраціць яго жонка».

Станіслаў Лем.

Усміхнёмся!

Дзве сяброўкі:

— Ты чаму такая сумная?

— Ды пазнаёмілася з адным сімпатычным хлопцам, а ён сказаў, што будзе са мной сустракацца, толькі калі падняць мой ай-к'ю хоць бы да сарака!

— Гэта па Цэльсію ці Фарэнгейту?

— Я ў гэтым нічога не разумею, але ён казаў нешта пра сорак па Мендзялееву.

☺

У навагоднюю ноч у выцвярэзнік было дастаўлена пяцьдзесят чалавек і чатырнаццаць снегавікоў. Прычыны памылковых дзеянняў міліцыянераў высвятляюцца.

Тэлесеткі

Бац-бац, і — міма...

Удзельнікі праекта «Цудоўная сямёрка. Эпізод 5» на сабе выпрабавалі, ці лёгкі хлеб у біятланістаў.



У рэаліці-шоў тэлеканала «ЛАД» «Цудоўная сямёрка» ўдзельнічаюць людзі вядомыя, папулярныя — артысты, акцёры, журналісты, тэлевядучыя. Але, у адрозненне ад многіх іншых шоў, дзе ад іх патрабуецца толькі ўпрыгожваць кадр, вядучыя «Цудоўнай сямёркі» выціскаюць з удзельнікаў літаральна ўсе сокі. А як інакш, калі праект прысвечаны здоравому ладу жыцця: сем эпізодаў — розных відаў спорту, па сем удзельнікаў у кожным, а ў фінале — сем пераможцаў збяруцца паспаборнічаць за званне лепшага і галоўны прыз — дарагі джып.

Праект стартаваў яшчэ летась зімой, і тады першым удзельнікам давялося засвоіць горныя лыжы. У спаборніцтве перамагла спявачка Алеся. Другі, «летні» эпізод — спаборніцтвы па вадналыжных гонках — выйграла Вольга Барабаншчыкава. Лепшай у трэцім эпізодзе — сінхроннsv плаванні — стала вядучая «Калыханкі» Алена Бікрэнева, а ў чацвёртым — конны спорце — перамога дасталася Аляксею Хлястову. Нядаўна быў зняты чарговы, пяты эпізод — біятлон. Удзел у ім узялі артыстка прадзюсарскага цэнтра «Спамаш» Алена Ланская, лідар гурта «Без білета» Віталь Артыст, удзельнік гурта «Тяни-Толкай» Павел Таралімовіч, спявак Аляксандр Патліс, тэлевядучая Аксана Вечар, заслужаны майстар спорту па мастацкай гімнастыцы Яўгенія Паўліна і журналіст газеты «Советская Белоруссия» Вікторыя Папова. Навуку «страляючых лыжнікаў» наваспечаным спартсменам выкладалі пяцікратны чэмпіён свету Вадзім Сашурын і ўладальніца 17 медалёў чэмпіянатаў свету Алена Зубрылава.

З першых жа крокаў на лыжах вызначыліся лідары — Аляксандр Патліс і Віталь Артыст імчаліся з хуткасцю ветру, пакідаючы далёка за спінай астатніх удзельнікаў. Як высветлілася, выканаўцы час ад часу трэніраваліся, у адрозненне ад дзяўчат, многія з якіх апошні раз стаялі на лыжах яшчэ ў школе. «Ой, не мне дастанецца галоўны прыз — ноўтбук», — сумавала спявачка Алена Ланская, якая ўсё ніяк не магла справіцца з каньковым ходам. Затое страляла выдатна, пяць з пяці, чым выклікала заслужанае адабрэнне трэнераў і нават прапанову «Алёна, кідай ты гэты шоў-бізнэс, ідзі да нас у біятлон».

...Хто ў рэшце рэшт перамог у пятым эпізодзе, прадзюсары «Цудоўнай сямёркі» прасілі заўчасна не раскрываць — з 15 лютага гледачы ўсё змогуць убачыць і самі. А ўдзельнікі, між іншым, так пасябравалі за час трэніровак, што незалежна ад вынікаў спаборніцтва дамовіліся сустракацца ў Раўбічах на лыжні.

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.
Фота прадзюсарскага цэнтра «Спамаш».

ОАО «Каскад-93» сообщает о проведении 12 марта 2008 года очередного общего собрания в очной форме присутствия акционеров

ПОВЕСТКА ДНЯ:

1. Отчет о результатах деятельности ОАО «Каскад-93» за 2007 год.
2. Заключение Ревизионной комиссии по годовому отчету и балансу ОАО «Каскад-93».
3. Утверждение годового баланса ОАО «Каскад-93».
4. Утверждение направлений использования чистой прибыли, полученной в 2008 году.
5. Избрание членов Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии.
6. Об условиях вознаграждения членов Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии.
7. Об установлении пределов сумм оказания ОАО «Каскад-93» безвозмездной (спонсорской) помощи на 2008 год.

Место проведения: г. Минск, ул. Ф. Скорины, 14—226.
Начало собрания в 14.00.
Начало регистрации в 13.00.

Тел. для справок: 017 298 57 68, 298 59 52; 029 629 16 18.

УНП 100016908.

Доктор Алексей Алексеевич ХАДОРКИН:

при алкогольной, никотиновой, пищевой зависимости люди пытаются бороться со стрессом, употребляя спиртные напитки, сладкое, пищу, включающую жиры и муку, никотин. Это неправильно! Если вы сами не можете отказаться от этих привычек, мы окажем психологическую помощь. Так же успешно лечатся псориаз и энурез у детей.

Запись на прием по телефонам:

Минск 292-72-73	**Слуцк 2-99-19**
Брест 25-14-67	**Жлобин 5-11-42**
Барановичи 42-06-95	**Могилев 27-26-48**
Борисов 73-37-77	**Пинск 37-32-42**
Бобруйск 43-81-11	**Светлогорск 2-72-71, 2-16-55**
Витебск 36-40-30	**Речица 3-52-77**
Молодечно 7-01-88	**Мозырь 2-35-07, 4-60-85**
Орша 21-40-40	**Гродно 74-04-24, 41-42-39**
Полоцк 43-58-61	**Волковыск 2-11-85**
Солигорск 23-85-07	**Лида 4-59-20.**

Лицензия МЗ РБ № 02040/0311208 от 27.10.2006 г. до 27.09.2011 г.

Простая мова

Нельга вярнуць... Можна — не страціць

...У тралейбусе (відаць, добра пасварыўшыся?) яны едуць моўчкі, як чужыя. Гэтак жа выходзяць, стаяць на прыпынку — паводдаль адно ад аднаго і, лічы, адвярнуўшыся...

Адвярнуліся, у сэнсе — не пазіралі б на іх, і людзі, калі б не адна абставіна — дзеці: дзве абсалютна аднолькавыя дзяўчынкі, у цёмных штоніках, у чырвоных куртачках, белых шапках. Двайняткі...

Адну, за ручку, моцна трымае бацька, другую — маці.

А малыя ж, відаць, прывыклі быць побач, разам.

Таму цяпер, нічога не разумеючы, пакутліва пазіраюць адна на адну, усімі істоткамі цягнуцца...

Быццам хочуць злучыць, тое, што не павінна парвацца.

За што змагаўся...

Ля банкамата чарга. Што раздражняе, бо мала таго, што гэтую капейку цяжка зарабіць, дык яшчэ і атрымаць...

Але сёння злаваць не хочацца: хлопец напярэдзе — у зашнураваных высокіх ботах, у светлых клятчастых портках, у жаўтаватай куртцы... А галоўнае — не галава ў яго, а «твор мастацтва»: валасы на скронях і на патыліцы — кароткія, колеру саломы, на макаўцы — вогненна-рыжыя, досыць доўгія і тырчком, як іголкі ў вожыка. Карацей, разглядаў бы і разглядаў, як «карціну маслам».

Што чарга, здаецца, і робіць?

Хлопец на гэта спярша не зважае, потым — пачынае нервавацца.

...А, уласна, чаго? Хацеў жа, мусіць?

А іначай — навошта «касіць пад вожыка»?

Сорам не дым...

Жыць па сродках (ды пры сённяшніх цэнах) умеюць не ўсе. А многія — і не вучыліся, бо нічога дрэннага не бачаць у тым, каб нейкую суму пазычыць.

У сяброўкі калега трыста тысяч узяў. На месяц. Прайшло два, потым — тры, чатыры... Яна разоў колькі парывалася напомніць яму, нават рот адкрывала... У апошнюю хвілінку нейкі тормаз спрацоўваў. Думала, што ён жа і сам, відаць, перажывае, начамі не спіць, думае, як зэканоміць, як зарабіць...

Маўчала... Ці не месяц яшчэ.... А потым на рабоце размова зайшла — якраз пра даўгі. І быццам чорт за язык пацягнуў: мовіла, што вось і ў яе, з паўгода ўжо, як Пятровіч грошы пазычыў...

Таго як варам абліло. Сказаў:

— Во людзі, во людзі — зусім сумлення няма!.. Не паўгода прайшло, а чатыры з паловай месяцы...

Сяброўцы, карацей, стала сорамна — за сваю недакладнасць.

А яму — за тое, што грошы не аддаў — нікольі.

Аргумент. На карысць... беднасці

Усё, як ва ўсіх (ці ў многіх?) — субота, раніца, рынак... Крыху не разлічыла там, «перабрала»: здавалася, толькі кілька таго, кілька другога, а сумкі цяжкія, не разгонішся — памалу іду.

Напярэдзе, і акурат таксама, два мужыкі — гуляюць, шпацыруюць, перамаўляюцца, на хаду гарбузовыя семкі ядуць, шалупіннем чорную сцежку беляць.

— Во... А каб гэтак усе, — скардзуся дзеду, што тэпае побач.

— Не, — разважае ён. — Усе — так не пойдуць... Ва ўсіх яно, гэта... На семкі грошай няма.

...Што — як высвятляецца — хоць у нечым, ды ўсё ж такі добра.

Пугай — не трэба

Радок са слоўніка (звычайнага): «Пуга — прымацаваны да палкі кусок вяроўкі або сырамяці, якім паганяюць жывёлу». На нашым, журналісцкім жаргоне, гэтым жа словам называюць нецікавы доўгі артыкул...

Тое, што ён доўгі, бачыцца, вядома ж, адразу, тое, што нецікавы, на жаль, не — трэба прачытаць, хоць колькі абзацаў. І... успомніць анекдот. Лекцыя — люд сышоўся, выступоўца на трыбуну залез, штось бубніць. Голас з залы:

— Э-э, гучней трохі можна?

Лектар:

— А яно вам трэба?

...Дык, мо, і з артыкулам так? Не цікава, значыць, не трэба. Бо што той пугай па вадзе, што гэтай, вынік, як правіла, адзін. Дакладней — ніякага.

Хачу — як усе!

За вочы мы завём Наймудрэйшай... Што, між іншым, чыстая праўда. Але ж у вочы яе казаць не прынята (ну такія мы...). Таму — па імені бацькі.

З Леанідаўнай (ёй 80 з хвосцікам) у той раз гаварылі пра моладзь, пра хлопцаў і дзяўчат. Яна здалёк пачынае: вось гуляю я, кажа, неяк летам па вуліцы. Спераду — дзяўчо ідзе: ножкі доўгія, роўныя, с... кругленькая, спінка голая, па плячах валасы рассыпаны. Прыгожая — вачэй не адвесці. Я любуюся... А ўжо хлопцы, думаю... Азіраюся — яны якраз побач ідуць: піва смокчуць, чыпсы ядуць, балаболяць... На фігурку тую, не паверыце, нуль увагі! Думаю: а чаму ж гэта? І ўвачавідкі бачу, што дзяўчат такіх — проста шмат. Усе ў кароткіх спаднічках ці джынсіках, усе з такімі ж голымі спінкамі... Адналькавае не вабіць, разумееце? А нечага адметнага і таму прыцягальнага, — лічы, нямашака.

...Не ведаю, як вам, мне асабіста шкада, што гэтыя словы пачуюць не ўсе. А калі і пачуюць, то, наўрад ці паверачь. І таму па-ранейшаму будуць «сядзець» на дыетах, будуць худзець, будуць млець па спаднічках-джынсіках са спушчанай таліяй, будуць агаляць спінкі-жываты. Іншымі словамі, будуць імкнуцца зрабіць усё, каб пазбавіцца... сваёй адметнасці, індывідуальнасці, каб стаць, як усе, як іншыя.

Марыць не шкодна

...Малы заквёліўся ў нядзелю. Бліжэй да вечара падскочыла тэмпература. Але не страшна: з «хуткай» рашылі пачакаць. Тым больш што педыятр іх гэтага не любіць.

У панядзелак доктарка прыйшла, паглядзела, нічога канкрэтнага не сказала, апроч шматзначнага «Будзем назіраць».

Вечарам, калі на скуры ў малога з'явілася высыпка, у «хуткую» усё ж пазванілі. Доктар, якога яна прывезла, рукі не мыў, ліхтарыка, каб паглядзець горла, не меў, але ж прапанову выказаў, што гэта альбо адзёр, альбо краснуха — трэба назіраць.

Ад назіранняў аднак лепей не рабілася — «хуткую» выклікалі яшчэ раз. Яна (з падазрэннем на шкарлятыну) завезла малога ў бальніцу. Там з'явіўся новы дыягназ — інтэравірусная інфекцыя, з-за якой, лічы, усіх паспелі «паставіць на вушы»...

Але потым аналізы паказалі, што ў хлопчыка вірусная інфекцыя з алергічнай высыпкай, якая, тым часам, плаўна перацякла ў бранхіт: другі месяц лечацца.

...На пытанне, аб чым вы марыце, адзін з суразмоўцаў некалі сказаў: «Памерці маладым...». «Дзівак-чалавек», — падумала тады — Бо, здавалася, як такога можна хацець? А крый Божа марыць...

Цяпер — я яго разумею. І ўсё бліжэй бачачы, што («з лёгкай рукі» асобных дактароў) могуць зрабіць з чалавекам хваробы і гады, пачынаю марыць аб тым жа: як бы дажыць, каб не дажыць.

А свет — не заплакаў

Зноў інтэрв'ю: у жанчыны досыць сталага веку распытваю пра тое, дзе вучылася-працавала, як жыве і жыла.

Сумнаваты ў яе аповед, бо мужык даўно і цяжка хварэе, інвалід. Так што дачку «цягнула» адна... Ды і цяпер вось — з ёй удваіх «цягнуць» (трэба разумець, гадуюць?) дзвюх дзяўчынак-унучак.

— А зяць?.. — пытаю, хутчэй, «з разгону».

— Памёр. Няма...

— Прабачце! — чырванею за сваю нетактоўнасць, бо жанчыне на выгляд гадоў 50. Значыць, дачцэ — каля 30. Прыкладна ж столькі было, мусіць, зяцю: не жыў, лічы...

— Што ж сталася? — пытаю, жахнуўшыся.

— Ды гарэлкай змыла, — уздыхае кабета.

І потым ціха дадае, што яны з дзецьмі хоць... аджылі цяпер, начаваць дома сталі.

...З прапіснога: «Калі ты нарадзіўся, ты заплакаў, а свет засмяяўся. Жыві так, каб памяркуючы, ты смяяўся, а свет — плакаў».

Нешта, мусіць, стала з ім, з гэтым светам: ён цяпер далёка не заўсёды смяецца, бачачы, што чалавек з'явіўся. Далёка не заўсёды плача. Калі ён сыходзіць.

Але, каб радаваўся... Бывае.

Нельга вярнуць...

Чужая думка: з дапамогай тэлевізара ў нашы дамы прыходзяць людзі, якіх у звычайным жыцці мы і на парог не пусцілі б...

Зрэшты, зусім без тэлевізара таксама нельга. Асабліва — калі топчышся па кухні, калі...

Прасаваць вось бяруся. Уключаю. Нешта... Пасля чарговай рэкламы, якраз расказваюць, што: маладзічка адна развялася з мужам і вельмі пакутавала; вядучыя праграмы (яны ж — жанчыны, якія развод ужо перажылі) узяліся ёй паспрыяць. Па-першае, дапамаглі знішчыць усё, што нагадвала пра былога (дзяцей, свят-свят-свят, падобна, не было. — **Аўт.**). Па-другое, павялі па буціках (гэта модныя крамкі такія) і з дапамогай прафесійных мадэльераў прыгожа апранулі. Па-трэцяе — такія ж прафесіяналы начарадзейнічалі над прычоскай і тварам, па-чацвёртае, падарылі падарожжа ў казачнае мінулае, фантастычную чырвоную сукенку і рамантычны вечар з маладым чалавекам у рэстаране... Папятае (гэта я ўжо бачыла. — **Аўт.**), дызайнеры-будаўнікі непазнавальна змянілі яе кватэрку. І вось — лагічнае завяршэнне: геройка — натхнёная, маладая, прывабная, гатовая распачаць новае жыццё — павінна сустрэцца з былым...

Былое тое (у асобе былога мужа) заходзіць у пакойчык, спакойна садзіцца ў крэсла (камера ўсё фіксуе). Там жа — з'яўляецца яна і праз паўзу (трэба разумець, на ўражанне) какетліва пытае:

— Ты пазнаў мяне?..

Ён:

— Так.

Яна (адказ прапусціўшы міма вушэй):

— І чаго цяпер больш за ўсё хацеў бы?..

Паводле яе меркавання ён, ну зразумела ж, проста павінен быў «не пазнаць», рассыпацца ў камплiментах, упасці на калені, а потым — цалаваць падлогу і прасіць: «Прабач!» Паводле яго —

— Ніколі цябе не бачыць...

Жорстка? Так. Але ж іншым, мо, відавочна: павагу, каханне (калі, вядома ж, разумець пад ім не працэс, якім можна займацца, а пачуццё... Прытым сапраўднае) нельга вярнуць...

А тым больш з дапамогай новай сукенкі, прычоскі і тэлевізійнай камеры.

Усё было...

Гандляром, як і паэтам, трэба нарадзіцца. Бо вось універсам. Плошчаў — хоць на верталётах садзіся, а тавараў мала, выбару ніякага. У двух кварталах ад яго — маленькі прадуктовы. Нават не магазін, — магазінчык, а купіць там можна ўсё. І, галоўнае, хутка. Было... Пакуль...

Сабачку ля ўвахода неяк раз згледзелі — невялічкага, рыжага, а ўжо адданага... Колькі людцаў вакол, колькі пахаў і гукаў, — ён — нуль увагі: не купляецца, не прадаецца. Ён, не мігаючы, на дзверы глядзіць.

Позірк гэты разумеўся лёгка: гаспадар, відаць, у краму пайшоў, сабака — чакае...

Здзіўляла толькі, што доўга... Чакае. Бо мы купілі ўсё, выйшлі — рыжык сядзеў.

Якое ж было здзіўленне, калі на тым жа месцы, у той самай позе ён сядзеў... праз дзень. І нават праз два...

Карацей, у той маленькі магазін, дзе заўсёды і ўсё было, мы больш — ні нагой.

Так лягчэй паверыць, што гаспадар таго рыжыка жывы і здаровы, што сабаку ён не выганяў і што ўсё ў іх па-ранейшаму, па-людску.

...Трэба ж нечым сябе суцяшаць.

Калі (па вялікім рахунку) дапамагчы не можаш. Нават сабаку.

Валянціна ДОЎНАР.

Ад яе ж... І, магчыма, новым падпісчыкам. З такіх вось карацелек-абразкоў два гады таму склалася кніжка. Называецца яна «Праз каханне» і, напэўна ж, яшчэ прадаецца на асобных поштах (дакладна — у

Генеральны дырэктар Валянцін ЯСЬКОЎ атрымлівае з рук віцэ-прэм'ера Андрэя КАБЯКОВА Дыплом лаўрэата Прэміі Урада Рэспублікі Беларусь за дасягненні ў галіне якасці 2007 года.

«ЛІДСКАЯ» – ЗНАЧЫЦЬ ЯКАСНАЯ!

Штрыхі да «партрэта» вытворцаў знакамітай мукі, якой аддае перавагу большасць беларускіх гаспадынь

Напярэдадні камандзіроўкі ў Ліду адзін з аўтараў гэтай публікацыі, мінчанін, пацікавіўся ў жонкі, якую муку яна купляе. Аказваецца, лідскую, у фірменным пакеце з млынам. Чаму? А таму, маўляў, што выбар, якому прадукту аддаць перавагу, у гэтай канкрэтнай сям'і даўно зроблены. «Лідская» ніколі не падводзіла і ўжо нават немагчыма ўявіць без яе нейкую выпечку.

Такога ж меркавання прытрымліваецца пераважная частка беларускіх гаспадынь. Аб гэтым сведчаць, у прыватнасці, вынікі сацыялагічнага апытання, якое праводзілася ва ўсіх абласцях рэспублікі Міжнародным агенцтвам сацыяльных і маркетынгавых даследаванняў у рамках конкурсу «Прадукт года-2007». ААТ «Лідахлебапрадукт» удзельнічае ў гэтым прэстыжным конкурсе з 2004 года і кожны раз з вялікім адрывам ад бліжэйшага канкурэнта займае першае месца. Вось і цяпер з 1200 удзельнікаў апытання 817 (!) паведамілі, што часцей за ўсё купляюць менавіта прадукцыю з гандлёвай маркай «Лідская Мука». Пры гэтым вызначальны фактар — яе выдатныя смакавыя якасці. Пакупнікі таксама адзначылі прымальную цану, даступнасць лідскай мукі (лёгка знайсці ў продажы), высокую рэпутацыю гандлёвай маркі, зручную ўпакоўку.

Дарэчы, па выніках конкурсу «Прадукт года-2007» ААТ «Лідахлебапрадукт» атрымала не толькі Дыплом I ступені, але і Гран-пры як адзін з дзесяці лепшых вытворцаў прадуктаў харчавання на тэрыторыі Беларусі. Другі год запар!

Але і гэта былі яшчэ не ўсе ўзнагароды «Лідскай Мукі» ў мінулым годзе. У ліку 17 прадпрыемстваў і арганізацый краіны ААТ «Лідахлебапрадукт» удастоена Прэміі Урада Рэспублікі Беларусь за дасягненні ў галіне якасці ў 2007 годзе.

Як жа фарміруецца гэта ўзорная якасць? Зразумела, ва ўсіх мукамолаў ёсць пэўныя прафесійныя сакрэты, як кажуць, толькі для ўнутранага карыстання. Але з некаторымі складальнікамі знакамітага брэнда журналістам «Звязды», мяркуем, удалося азнаёміцца. І не толькі чыста тэхналагічнымі.

«Візітная картка» ААТ «Лідахлебапрадукт»

Прадпрыемства працуе з 1984 года. Цяпер гэта, можна сказаць, холдынг, у склад якога ўваходзяць элеватар для захоўвання збожжа, млын, камбікормавы комплекс, Іўеўскі вытворчы ўчастак са складамі для прыёму, захоўвання і водпуску збожжа і гатовай прадукцыі, Ашмянскі гандлева-вытворчы філіял, свінагадоўчыя комплексы «Оркавічы» ў Навагрудскім і «Прагрэс» у Лідскім раёнах, птушкафабрыка ў вёсцы Падбалотцы Смаргонскага раёна. Працуюць таксама падсобныя прадпрыемствы будаўнічага і швейнага профілю (замяніць вокны, дзверы, пашыць спецадзенне і інш).

Калі яшчэ некалькі гадоў таму ў ААТ «Лідахлебапрадукт» выраблялі тры гатункі мукі, то цяпер — васемнаццаць (фасоўка — 1, 2, 5 і 50 кілаграмаў), у тым ліку дзесяць відаў з фітадабаўкамі — араматычнымі травамі, агароднінай, садавінай, марской капустай. Акрамя таго, прадпрыемства выпускае крупу манную фасоўкай 1 і 45 кг, шматкі пшанічныя зародкавыя, вотруб'е пшанічнае хлебапякарнае, крупку пшанічную вышэйшага гатунку. Вырабляюцца камбікармы для вырошчвання і адкорму свіней, курэй, буйной рагатай жывёлы, прэміксы, БМВД. Харчовыя канцэнтраты прадстаўлены «Піцай звычайнай», «Піцай дражджавой», а таксама блінчыкамі трох рэцэптур.

На прадпрыемстве, з улікам філіялаў, працуе больш за паўтары тысячы чалавек. **Генеральны дырэктар ААТ «Лідахлебапрадукт» — Валянцін Іванавіч ЯСЬКОЎ**, за плячамі якога вучоба ў Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі, вопыт работы на сельгасвытворчасці, у органах выканаўчай улады і ў галіне хлебапрадуктаў.

На ўсіх этапах вытворчасці – найвышэйшая адказнасць работнікаў

— Поспех любой справы — гэта цэлы тэхналагічны ланцужок з найвышэйшай адказнасцю работнікаў на ўсіх этапах вытворчасці, пачынаючы ад нарыхтоўкі сыравіны і заканчваючы рэалізацыяй прадукцыі, — лічыць Валянцін ЯСЬКОЎ. — Пэўна, ніводны камбінат хлебапрадуктаў не мае такой разгалінаванай гандлёвай сеткі, практычна па ўсёй рэспубліцы. Гэта не вельмі проста — прадаваць лідскую муку ў іншых рэгіёнах пры наяўнасці там іншых прадпрыемстваў нашай галіны. Тым не менш прадаём, прычым не дэмпінгуючы па цэнах. Мы ўдзячныя нашым спажыўцам і імкнёмся пастаянна падтрымліваць іх давер — новымі відамі прадукцыі і, безумоўна, яе якасцю.

— Як на прадпрыемстве стымулуецца якасная работа?

— Яе стымуляваць не трэба, яна павінна быць якаснай. А для гэтага неабходна ставіцца да сваёй працы так, як нашы мукамолы, нарыхтоўшчыкі сыравіны, спецыялісты вытворча-тэхнічнай лабараторыі, работнікі, якія займаюцца фасоўкай, рэалізацыяй прадукцыі і іншыя. Гэта значыць не фармальна падыходзіць да сістэмы кіравання якасцю (склалі паперу, у папку паклалі і забыліся), а кожны дзень на кожным рабочым месцы цвёрда прытрымлівацца тых патрабаванняў, якія закладзены ў нашых стандартах.

Пры гэтым, вядома ж, трэба праводзіць прафілактыку, скажам так, непажаданых момантаў. Тут шмат розных метадаў, у тым ліку і даволі жорсткіх. Безадказныя людзі ў нас доўга не затрымліваюцца.

— Гэта праўда, што лідскую муку ведаюць ужо і ў ЗША?

— Зразумела, ніхто не кажа, што мы накармілі Амерыку, але пробная акцыя (прапанова паступіла ад людзей з беларускімі каранямі) аказалася паспяховай. Усё прадалося з фінансавай выгадай для нашага прадпрыемства. Другая пастаўка будзе ўжо ў большым аб'ёме.

Акрамя таго, нядаўна рэалізавалі партыю мукі ў Смаленскую вобласць, ёсць прапановы з Таджыкістана, Малдовы і іншых краін. Мы маглі б павялічыць аб'ёмы вытворчасці, але стрымлівае недахоп сыравіны. Таму, спадзяёмся, што сем-восем мільёнаў тон збожжа — гэта для нашай рэспублікі не мяжа, за кошт лепшай ураджайнасці можна атрымліваць і дзесяць мільёнаў тон.

— Свінагадоўчыя комплексы, птушкафабрыка — гэта для прадпрыемства не абуза?

— Справа ў тым, што спажыванне мукі ў структуры харчавання людзей не павялічваецца і рынак яе рэалізацыі абмежаваны. А прадпрыемству трэба развівацца, праводзіць удасканаленне, рэканструкцыю вытворчасці. Ніхто ж не падорыць нам грошай на тую ж мадэрнізацыю камбікормавага цэха, млына — мусім зарабляць самі, прычым ва ўмовах абмежавання цэнаў на сацыяльна значную прадукцыю, рэнтабельнасці яе выпуску.

Таму мы ўскладаем вялікія надзеі на перададзеныя прадпрыемству два свінагадоўчыя комплексы па 24 тысячы галоў і птушкафабрыку, тым больш, што самі вырабляем для іх камбікармы. Так, комплексы не ў лепшым стане, патрабуецца іх сур'ёзная рэканструкцыя, што мы цяпер і робім. Укладваем грошы з тым, каб у далейшым атрымаць аддачу. На парадку дня і рэканструкцыя птушкафабрыкі ў вёсцы Падбалотцы Смаргонскага раёна (аблвыканкам дапамагае ў атрыманні льготных крэдытаў), якая дасць павелічэнне вытворчасці мяса як мінімум у тры разы. Да таго ж, будзе вырашацца праблема з працаўладкаваннем тутэйшага насельніцтва.

— Валянцін Іванавіч, якія першачарговыя задачы ставіце перад сабой і калектывам на бліжэйшую перспектыву?

— Самая галоўная задача — не толькі захаваць дасягнуты ўзровень па якасці і аб'ёмах рэалізацыі нашай прадукцыі, але і развівацца далей. Ёсць задумкі па новых відах прадукцыі, не будзем у баку ад сучасных патрабаванняў да абсталявання і тэхналогій.

1. **За пультам кіравання мукамольнага цэха начальнік змены Аляксандр ТУРАНЦАЎ і аператар Таісія КРУПАВЕЦ.**
2. **Апаратчык Вольга ДЗЕМБА працуе на ўчастку фасоўкі мукі.**
3. **Гатовую прадукцыю дастаўляе на склад вадзіцель электрапагрузчыка Пётр ПЯТРЭНКА.**
4. **«Калектыў ганарыцца сваімі перадавікамі», — гаворыць намеснік генеральнага дырэктара па ідэалагічнай рабоце Уладзімір ТРУПП.**

ДА ЎВАГІ ПАКУПНІКОЎ

Мука пшанічная гатунку «Экстра» адрозніваецца самай высокай ступенню белізны, яна ідэальна падыходзіць для выпечкі пірагоў, пячэння, прыгатавання бісквітных рулетаў.

Мука пшанічная вышэйшага гатунку «Адборны» вылучаецца самай вялікай колькасцю клейкавіны. Калі вы любіце самі гатаваць пельмені, то цеста атрымаецца цудоўным. Мука гэтага гатунку таксама выдатна паслужыць для прыгатавання слоенага і заварнога цеста.

Мука пшанічная вышэйшага гатунку прызначана для прыгатавання хлеба, сушак, сухароў, а таксама разнастайных кандытарскіх вырабаў — тартоў, пірожных, кексаў, пернікаў, пячэння.

Мука пшанічная першага гатунку — таксама выдатны прадукт для кандытарскіх вырабаў, з якой атрымліваюцца смачныя тарты, пірожныя, вафлі...

Фітадабаўкі, якія дабаўляюцца ў муку, аказваюць агульнаўзмацняльнае дзеянне, дапамагаюць пазбавіцца ад шкоднага халестэрыну, насычаюць арганізм ёдам, падтрымліваюць нервовую і сардэчна-сасудзістую сістэмы, паляпшаюць страваванне, выводзяць таксіны.

У прыватнасці, **фітадабаўка «Брыз»** распрацавана на аснове натуральных кампанентаў марской капусты, аўса, кукурузы, кмену, кораня любісты, кожны з якіх клапоціцца аб здароўі чалавека, а разам — аказваюць агульнаўзмацняльны і танізуючы эфект.

Фітадабаўка «Баярская» ўтрымлівае глог, грэчку і мяту, багатая на вітаміны групы В, аказвае антыстрэсавае дзеянне на арганізм. Глог з'яўляецца сардэчным тонікам, мякка паніжае ціск, грэчка і мята супакойваюць нервовую сістэму.

Фітадабаўка «Нектар» — з яблыкаў і морквы. В-карацін, які маецца ў моркве, павышае вастрыню зроку, калій узмацняе сардэчную мышцу. Да таго ж, морква валодае проціпухлінным і радыёпратэктарным дзеяннем.

Фітадабаўка «Дар прыроды» — гэта кампаненты тапінамбуру, пастарнаку, цыкорыю. Тапінамбур утрымлівае інулін цукар, які няшкодны для людзей, схільных да яго павышанага ўтрымання ў крыві, а таксама для хворых на цукровы дыябет. Ён багаты на жалеза, крэмній, цынк, а таксама на бялкі, пекцін, амінакіслоты, арганічныя і тлустыя кіслоты. Пастарнак і цыкорый валодаюць цукрапаніжальнымі ўласцівасцямі. Акрамя таго, пастарнак узмацняе сасуды, карысны пры сардэчна-сасудзістых захворваннях.

Фітадабаўка «Янтар», з яблыкаў і вотруб'я, нармалізуе абмен рэчываў у арганізме. Яблыкі — універсальная крыніца вітамінаў і мінеральных рэчываў. Вотруб'е таксама вельмі карыснае, паколькі па ўтрыманні клятчаткі пераўзыходзіць многія крупы. А нармальнае страваванне без клятчаткі практычна немагчыма.

Мучныя паўфабрыкаты для выпечкі піцы і блінчыкаў утрымліваюць аптымальную колькасць патрэбных інгрэдыентаў і застрахуюць вас ад кулінарных памылак. Вы станеце прафесіяналам па хуткім прыгатаванні сапраўдных гастранамічных шэдэўраў!

«Піца звычайная». У яе складзе — мука пшанічная вышэйшага гатунку, сода пітная, соль павараная ёдаваная. Для прыгатавання трэба да змесціва пакета дадаць 250—275 мл сыроваткі альбо кефіру і размяшаць. Цеста раскатаць і выкласці ў форму. Зверху пакласці начынку: цвёрды сыр, вяндліну, каўбасныя вырабы, памідоры, масліны, кетчуп і іншыя прадукты на смак.

«Піца дражджавая». У склад гэтага рэцэпта, акрамя мукі пшанічнай вышэйшага гатунку, солі павараная ёдаваная, увходзяць сухія дрожджы і цукар. Дадаём 250 мл падагрэтай сыроваткі ці кефіру, размешваем да аднароднай масы, ставім у цёплае месца на 30—40 хвілін і атрымліваем дражджавое цеста для выпечкі піцы.

Спосаб прыгатавання блінчыкаў (тры рэцэптуры):

Да 200 грамаў харчовага канцэнтрату дадаць 320 мл вады для рэцэптуры № 1, 320 мл — для рэцэптур № 2 і № 3, старанна размяшаць для атрымання аднароднай масы. Выпякаць да гатоўнасці на алеі. Можна гатаваць з рознымі начынкамі.

Лідскае «меню» для «датчан»

Свінагадоўчыя комплексы «Оркавічы» ў Навагрудскім і «Прагрэс» у Лідскім раёнах сталі вытворчымі падраздзяленнямі ААТ «Лідахлебапрадукт» у далёкім ад сучасных патрабаванняў стане — састарэлыя тэхналогіі, шмат ручной працы.

— Прадукцыйнасць пагалоўя свіней на гэтых комплексах нас задаволіць не можа, — зазначае Валянцін ЯСЬКОЎ. — Таму мы заключылі дагавор аб супрацоўніцтве з Гродзенскім дзяржаўным аграрным універсітэтам, які прадугледжвае распрацоўку новых рэцэптаў камбікармоў і генетычнае паляпшэнне свінапагалоўя. І першыя вопыты, якія ўжо праведзены, далі вельмі добры вынік.

— Я хацеў бы падзякаваць кіраўніцтву і спецыялістам ААТ «Лідахлебапрадукт», якія не толькі паставілі задачы, але і стварылі належныя ўмовы для іх выканання, — гаворыць **загадчык кафедры прыватнай заатэхніі Гродзенскага дзяржаўнага аграрнага ўніверсітэта, кандыдат сельскагаспадарчых навук, дацэнт Пётр МАРДЗЕЧКА (*на фота*)**. — Пры правядзенні доследаў мне ішлі насустрач у любых пытаннях, паколькі вытворчасць была не зусім прыстасавана да таго, што мы хацелі атрымаць. У выніку сумеснымі намаганнямі былі распрацаваны рэцэпты камбікармоў, ужыванне якіх дазваляе парсючкам за 90 дзён дасягнуць 44-кілаграмовай вагі. Гэта адзін з лепшых паказчыкаў у рэспубліцы, які на 8,5 кілаграма перавышае вынік пры выкарыстанні на тым жа комплексе «Оркавічы» звычайных камбікармоў. Значыць, новыя камбікармы лепш збалансаваныя, іх кампаненты больш эфектыўна спажываюцца жывёлай. І цяпер камбікармы па гэтых рэцэптурах пойдуць у масавую вытворчасць.

Але не толькі дзякуючы сучасным кармам павышаецца прадуктыўнасць свінапагалоўя, важна палепшыць і яго генетычны патэнцыял. На комплексах ААТ «Лідахлебапрадукт» для апладнення свінаматак будзе выкарыстоўвацца высакаякасны біялагічны прадукт прывезеных з Даніі хракоў (Пётр Мардзечка ўдзельнічаў у распрацоўцы адпаведнай тэхналогіі для Цэнтра селекцыі і генетыкі ў свінагадоўлі, які створаны ў Шчучынскім раёне). Пасля апладнення хракамі дацкай селекцыі атрымліваецца прыбыўка прыплоду парсючкоў. Яны не толькі нараджаюцца мацнейшымі, але і павялічваецца мяснасць свініны, а гэта — адзін з найважнейшых фактараў канкурэнтаздольнасці прадукцыі на рынках. На свінагадоўчых комплексах ААТ «Лідахлебапрадукт» ужо праводзяцца доследы і па гэтым пытанні, як лічыць Пётр Мардзечка, зусім не апошнім, дзе дасць плён садружнасць вытворчасці з навукай.

ААТ "ЛІДАХЛЕБАПРАДУКТ"
231300, Рэспубліка Беларусь, г. Ліда, вул. Булата, 1,
тэл./факс: +375 (1561) 582 06, тэл.: +375 (1561) 582 04,
e-mail: lidamuka@mail.ru; www.muka.by. УНП 500022448.

У час абедзенняга перапынку каля більярднага стала ў спартыўнай зале збіраецца шмат аматараў.

Публікацыю падрыхтавалі Барыс ПРАКОПЧЫК, Віктар ПАЗНЯКОЎ, Яўген ПЯСЕЦКІ (фота).

Кожны ведае свой манеўр

Безумоўна, сацыяльныя паслугі патрабуюць ад прадпрыемства вялікіх затрат. І на розныя віды матэрыяльнай дапамогі, прадугледжаныя калектыўным дагаворам. І на тое, каб былі недарагімі вельмі смачныя і «змястоўныя» абеды ў сталовай. І асабліва на ўтрыманне дзіцячага садка ў пасёлку Індустрыяльны (каля 700 мільёнаў рублёў у год), хоць менш чым пятая частка яго наведвальнікаў — гэта дзеці і ўнукі работнікаў нашага прадпрыемства.

Дарэчы, каля 40 працэнтаў нашых спецыялістаў — гэта маладыя людзі ва ўзросце ад 20 да 35 гадоў, яшчэ каля 40 працэнтаў — ва ўзросце ад 35 да 45 гадоў.

Надзея ТЭРЗІ, намеснік начальніка вытворча-тэхнічнай лабараторыі:

— У 2004 годзе прадпрыемства атрымала, а праз тры гады пацвердзіла сертыфікат адпаведнасці сістэмы менеджменту якасці вытворчасці мукамольнай прадукцыі і яе расфасоўкі патрабаванням **СТБ ISO 9001-2001**. А ў 2006 годзе мы атрымалі экалагічны сертыфікат, які пацвярджае, што сістэма кіравання навакольным асяроддзем вытворчасці і рэалізацыі збожжа, мукамольнай і камбікормавай прадукцыі і абслуговых падраздзяленняў адпавядае патрабаванням **СТБ ISO 14001-2005**. Ёсць сертыфікат і па ахове працы.

Наша лабараторыя аснашчана найноўшым абсталяваннем і ўсё ж тэхніка без чалавека — нішто.

Валерый ЮРЧАК, начальнік мукамольнага цэха:

— Пытаеце, чаму наша мука якасная? У гэтым, лічу, заслуга нашага вядучага крупчатніка Драздова, які займаецца тэхналогіяй. Пётр Пятровіч усё жыццё адпрацаваў на млынах і тут — з пуску вытворчасці. Ён давёў гэты млын да дасканаласці, каб мука атрымлівалася такой, якая патрэбна спажыўцам. І мы гэту тэхналогію стараемся строга вытрымліваць.

А наконт таго, чаму лідская мука такая добрая ў выпечцы, лепш спытайце ў жанчын.

Святлана МАШЭЙ, апаратчык:

— Сапраўды, з нашай мукі ўсё вельмі добра выпякаецца. Памятаю, мая цётка з Мінщыны прасіла, каб я прывезла ёй лідскую муку, маўляў, толькі з яе і атрымліваюцца сапраўдныя касцёльныя апладкі. У той час там лідскую муку не прадавалі і добра, што цяпер у маіх сваякоў праблемы з яе набыццём няма.

Генадзь МАЛІНОЎСКІ, начальнік сектара фірменнага гандлю:

— Мы імкнёмся наблізіць сваю прадукцыю да спажыўцоў за кошт шырокай сеткі фірменнага гандлю. На сёння тры магазіны працуюць у Лідскім раёне, два — у Іўеўскім, адзін — у Воранаўскім. Ёсць таксама магазіны на станцыі Гудагай Астравецкага раёна і на Смаргонскай птушкафабрыцы, адкрываем у Карэлічах.

Леанід ГАРБОЎСКІ, спецыяліст па рэкламе:

— Брэнд «Лідская Мука» сфарміраваўся шматгадовай працай калектыву прадпрыемства, але мы не збіраемся, як кажуць, спачываць на лаўрах. Скажам, каб зацікавіць сваіх пастаянных і патэнцыяльных пакупнікоў, ужо два гады запар праводзілі рэкламную гульню. Купіў сем пакетаў з лідскай прадукцыяй (мука, піца, блінчыкі), забяспечыў месячную патрэбнасць сваёй сям'і і плюс яшчэ ўдзельнічаеш у розыгрышы прызоў. Для гэтага трэба было даслаць сем зорачак — латэктаграм (з іх дапамогай прадукцыя абараняецца ад падробкі), а галоўным прызам у мінулым годзе была турыстычная пуцёўка на дваіх у Рым.

Аль Абдалах Хайсам Ісмайл, загадчык здраўпункта:

— Я прыехаў у Беларусь з Лівана. Атрымаў вышэйшую медыцынскую адукацыю, пасля заканчэння вучобы прыехаў на Радзіму, але сітуацыя там была такая, што вырашыў вярнуцца. Працаваў у Гродне, і ўжо трэці год — выконваю абавязкі тэрапеўта, а таксама загадчыка здраўпункта ААТ «Лідахлебапрадукт». У нас таксама працуюць урач-стаматолаг, масажыст, фельдчар і санітарка, ёсць салярый. Усе нашы паслугі для работнікаў прадпрыемства бясплатныя, апаратура сучасная, матэрыялаў хапае. Дарэчы, падчас апошняга прафагляду паталогіі, дзякуй Богу і тым умовам працы, што створаны на прадпрыемстве, не выяўлена.

Мне добра жывецца ў Беларусі. Галоўнае тут — жыць законна, і ў цябе будзе ўсё нармальна.

У любы час вытворчая тэрыторыя прадпрыемства радуе вока чысцінёй.

Леў, лебедзь... І хто далей?

Майстар сіласнага атрада **Юрый ЖАМОЙДА** пераканаў, што тэрыторыя роднага прадпрыемства, дзе ён працуе з закладкі фундамента, павінна быць упрыгожана не толькі кветкамі, але і фігурамі жывёл і птушак. Адміністрацыя была не супраць.

У дзяцінстве Юрый захапляўся лепкай і бацькі думалі, што ён стане скульптарам, ды неяк не склалася. Але ж талент застаўся! Леў зроблены з бетону, што застаўся пасля рамонтных работ, а лебедзь — з дрэва. Працаваў майстар падчас абедзенных перапынкаў, заставаўся пасля змены. Цяпер калегі ў яго пытаюцца: якая скульптура наступная? Ідэі ў Юрыя Іванавіча ёсць, але якія — пакуль сакрэт.